КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №8 (136)
◂ 6 САКАВІКА ◂ 2009 г.

# Новы Час



**АЛЕГ ЦЫВІНСКІ: «БЕЛАРУСКАЙ ЭКАНОМІЦЫ НЕАБХОДНА ЛІБЕРАЛІЗАВАЦЦА»**

Стар. 4

**ВАЎКАВЫСКІ ВУЗЕЛ**

2 сакавіка на прэс-канферэнцыі міністр унутраных справаў Уладзімір Навумаў паведаміў журналістам, што бліжэйшым часам Мікалаю Аўтуховічу, Юрыю Лявонаву і Уладзіміру Асіпенку могуць высунуць новыя абвінавачванні

Стар. 5

**РЭЖЫМ НА ЭКСПАРТ**

Кітайская мадэль можа стаць глабальнай. Нягледзячы на эканамічны крызіс, Кітай пачаў пашыраць ідэйны ўплыў на краіны Трэцяга свету

Стар. 13

**МАСТАК ПАВЕЛ ЮЖЫК: ШЛЯХ ДА СЯБЕ…**

Стар. 14–15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

## Трэцясектарны беларус

Выклікі і магчымасці грамадзянскай супольнасці ў матэрыялах Вольгі Хвоін



# ФАКТЫ, ПАДЗЕІ, ЛЮДЗІ



## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### ЛІДА

**Прадстаўнікі грамадскіх арганізацый Ліды і раёна адзначылі 145-годдзе з дня вынасу смяротнага прысуду кіраўніку вызвольнага паўстання Кастусю Каліноўскаму.**

Яны наведалі пахаванні паўстанцаў у вёсках Далекія і Альжова, пабывалі на магілах святара Адама Фалькоўскага — аднаго з кіраўнікоў супраціву на Лідчыне і Валерыі Цыбульскай, якая пазбегла катаванняў і памерла праз семдзесят гадоў пасля паразы паўстання.

### АСТРАВЕЦ

**Зусім нядаўна пабачыў свет першы нумар бюлетэня «Астравецкі веснік».**

Ён прысвечаны праблеме будаўніцтва АЭС у Астравецкім раёне і спробам мясцовай грамадскасці яму супрацьстаяць. Новае выданне рэдагуе мясцовы дэмакратычны актывіст Мікалай Уласевіч, а падрыхтавана яно было пры дапамозе Эдуарда Брокарава з Магілёўшчыны, які выдае «Горацкі выбар».

### БРЭСТ

**У Брэсце праходзіць кніжная выстава, прысвечаная Сусветнаму дню пісьменніка, які адзначаецца 3 сакавіка.**

Экспазіцыя пад назвай «Саюзу пісьменнікаў Беларусі — 75» разгорнута ў абласной бібліятэцы імя М. Горкага. У першым раздзеле выставы прадстаўлены выданні пра творчасць беларускіх пісьменнікаў, а таксама кнігі, прысвечаныя гісторыі беларускай літаратуры, сучаснаму літаратурнаму працэсу і класічныя творы Я. Купалы, Я. Коласа, В. Быкава, І. Мележа, І. Шамякіна, А. Адамовіча. Другі раздзел выставы ўключае зборнікі твораў беларускіх паэтаў — М. Багдановіча, А. Куляшова, М. Танка, Я. Янішчыц, Р. Барадуліна, Р. Баравіковай.

У межах Сусветнага дня пісьменніка таксама пройдзе прэзэнтацыя кнігі выкладчыка Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта Анатоля Гладышчука «Нямцэвічы. Сапраўдныя гісторыі», што нядаўна пабачыла свет у выдавецтве «Літаратура і мастацтва».

### ГЛЫБОКАЕ

**У Глыбокім з ініцыятывы каталіцкага храма Святой Тройцы ў дні Вялікага посту праходзіць дабрачынная акцыя «Дзеці — дзецям».**

З 25 лютага (Попельнай серады), калі ў каталікоў пачаўся Вялікі пост, дзяцей, якія наведваюць нядзельную школу пры храме, просяць адмовіцца ад цукерак, шакаладу і іншых кандытарскіх вырабаў на карысць выхаванцаў прытулку.

Кожную нядзелю пасля набажэнства ў касцёле маленькія вернікі могуць пакласці ласункі ў спецыяльна ўстаноўлены кошык. Затым на свята Вялікадня гэтыя ласункі будуць перададзены выхаванцам дзіцячага прытулку ў вёсцы Станулі непадалёк ад райцэнтра.

## ДЫЯСПАРА

# БЕЛАРУСЫ СВЕТУ ЗБЯРУЦЦА НА З'ЕЗД

**На 18–19 ліпеня 2009 года ў Мінску запланаваны V З'езд беларусаў свету, паведаміла БелаПАН намесніца старшыні рады МГА «Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына» і старшыня рабочай групы па падрыхтоўцы форуму Ніна Шыдлоўская.**

Паводле яе слоў, гэтай тэме было прысвечана пасяджэнне малой рады аб'яднання, якое адбылося ў Мінску 2 сакавіка. На пасяджэнні была названа тэма будучага з'езда — «Нацыянальная ідэнтычнасць беларусаў у сучасным свеце: праблемы захавання і развіцця». Вызначаны таксама тры секцыі, якія будуць працаваць на форуме: «Сродкі нацыянальнай ідэнтыфікацыі беларусаў у Беларусі і свеце (мова, літаратура, мастацтва, друк і г.д.)»; «Магчымасці ўзаемадзеяння метраполіі і дыяспары ў захаванні нацыянальнай ідэнтычнасці і культурнай спадчыны беларусаў»; «Супольная гістарычная памяць як аснова нацыянальнай еднасці беларусаў у свеце».

Як зазначыла Шыдлоўская, для падрыхтоўкі з'езда створаны арганізацыйны камітэт, у склад якога ўвайшлі 88 прадстаўнікоў з Беларусі і розных краін свету. Сустаршынямі аргкамітэта абраныя Радзім Гарэцкі, Аляксей Марачкін, Алена Макоўская з беларускага боку, Алег Рудакоў з Расіі і Вячка Станкевіч з ЗША. Сябры рады зацвердзілі план працы аргкамітэта і рабочай групы. У склад рабочай групы, якая будзе непасрэдна праводзіць падрыхтоўку з'езда, абрана 16 чалавек.

Паводле слоў старшыні рабочай групы, важным юрыдычным вынікам пасяджэння з'яўляецца зацвярджэнне нормаў прадстаўніцтва дэлегатаў на з'езд. Згодна з імі, на форум будзе вылучана 459 дэлегатаў ад 30 краін, у тым ліку Беларусі. Сябры малой рады зацвердзілі бюджэт з'езда і заслухалі інфармацыю пра пошукі памяшкання для правядзення сусветнага форуму. Як было зазначана, знайсці памяшканне ў Мінску вельмі складана. Так, перад апошнім з'ездам, які праходзіў у ліпені 2005 года, арганізатары шукалі памяшканне на працягу месяца. «Нехта нам адмаўляе, спасылаючыся на рамонт, як кіраўніцтва Рэспубліканскага палаца прафсаюзаў, нехта ўвогуле не дае адказу», — сказала Шыдлоўская. Вось чаму, паводле яе слоў, сябры малой рады пацвердзілі гатоўнасць у выпадку перашкодаў з атрыманнем памяшкання ў сталіцы метраполіі рыхтавацца да правядзення V З'езда беларусаў свету ў суседніх краінах.

## З'ЕЗД

# ПАЛІТЫЧНАЯ ІДЭЯ ДЛЯ ЎСІХ

Вольга ХВОІН

**Партыя Беларуская хрысціянская дэмакратыя (БХД) правяла ўстаноўчы сход.**

Адным з найбольш актыўных стваральнікаў партыі БХД з'яўляецца былы кіраўнік «Маладога Фронту» Павел Северынец. Аргкамітэт па стварэнню партыі актыўна пачаў дзейнічаць у 2005 годзе, за тры гады быў сфарміраваны неабходны для рэгістрацыі спіс сябраў структуры, распрацаваныя канцэпцыя і праграма партыі. Паводле статуту, мэтаю дзейнасці партыі БХД з'яўляецца пабудова незалежнай, заможнай, духоўна развітай, дэмакратычнай і прававой дзяржавы Рэспубліка Беларусь і дэмакратычнага грамадства на аснове хрысціянскіх каштоўнасцяў, патрыятызму, адказнасці, свабоды, сацыяльнай справядлівасці, салідарнасці.

Сябры аргкамітэта па стварэнню партыі перакананыя, што іх гатовыя падтрымаць да 80 працэнтаў жыхароў Беларусі. Пакуль у спісе заснавальнікаў для Міністэрства юстыцыі — 1060 чалавек. На з'ездзе прысутнічала 206 дэлегатаў і каля трохсот гасцей.

Варта адзначыць, што сам з'езд праходзіў у святочнай атмасферы, у шэрагах хадэкаў панавала згода. Статутныя дакументы, звароты, склад кіраўнічых органаў былі прынятыя хутка і фактычна аднадушна. Кіраўнікамі партыі былі абраныя чатыры сустаршыні: Павел Севярынец, Аляксей Шэін, Віталь Рымашэўскі, Георгій Дзмітрук. Кіруючым органам партыі з'яўляецца Нацыянальная рада, у якую ўваходзяць 70 чалавек. Дзесяць месцаў у ёй зарэзерваваныя для «vip-персон», сярод якіх чацвёра сустаршыняў, пастар Эрнест Сабіла, старшыня моладзевай арганізацыі «Малады фронт» Зміцер Дашкевіч, былы палітвязень, кіраўнік грамадзянскага руху «Ініцыятыва» Андрэй Кім, адказны сакратар аргкамітэта па стварэнні БХД Дзяніс Садоўскі.

Госці з'езду — беларускія і палітыкі і прадстаўнікі хрысціянска-дэмакратычных партый Еўропы — у сваіх выступах адзначалі важнасць гістарычнага моманту, зычылі партыі плёну на палітычнай ніве і поспехаў у рэгістрацыі, што куды цяжэй, чым заваяваць сэрцы і розумы беларусаў. Старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька зрабіў сустаршыням арганізацыі падарунак — папку дэпутата Вярхоўнага Савету 13-га склікання, як сімвал пераемнасці ўлады. Здзівіў прысутных сваім выступам старшыня «Маладога Фронту» Зміцер Дашкевіч. У прамове ён запытаўся ў хадэкаў, як яны могуць супрацоўнічаць з Аб'яднанымі дэмакратычнымі сіламі, калі туды ўваходзіць Партыя камуністаў Беларуская, бо «немагчыма сядзець на адной лаве з Богам і шайтанам». Пад апошнім Дашкевіч недвухсэнсоўна меў на ўвазе камуністаў. Пасля лідэр МФ працытаваў урывак са Старога Запавету, у якім гаворыцца пра забарону міжнацыянальных шлюбаў. Фактычна гэта быў адзіны «гарачы» момант з'езду, астатняе прайшло гладка, бы па пісаному.




Фота Юрыя Дзядзінкіна

## ВІЗІТ

# АДНОСНА ПАЗІТЫЎНАЯ СПРАВАЗДАЧА

Вольга ХВОІН

**На працягу двух дзён Упаўнаважаны Федэральнага ўрада Германіі ў Федэральным міністэрстве замежных спраў па палітыцы ў галіне правоў чалавека і гуманітарнай дапамозе Гюнтэр Наоке і паслы па правах чалавека з Даніі, Фінляндыі і Нідэрландаў знаёміліся з сітуацыяй у галіне правоў і свабод чалавека ў Беларусі.**

Упаўнаважаны Федэральнага ўрада Германіі і паслы правялі перамовы з першым намеснікам міністра ўнутраных спраў Куляшовым, намеснікам міністра юстыцыі Бодакам і прадстаўнікамі Міністэрства замежных спраў. Акрамя таго, амбудсмены сустрэліся з прадстаўнікамі апазіцыі, праваабаронцамі, прадстаўнікамі недзяржаўнай прэсы — шэф-рэдактарам «Новага часу» Аляксеем Каралём, старшынёй Беларускай асацыяцыі журналістаў Жаннай Літвіной, галоўным рэдактарам «Народнай волі» Іосіфам Сярэдзічам. Як паведаміла прэс-служба БАЖу, гасцей цікавілі ўмовы існавання недзяржаўнай прэсы пасля ўступлення ў сілу новага закона аб СМІ, уплывовасць незалежных медыяў у Беларусі ды іншыя аспекты працы сродкаў масавай інфармацыі.

Працоўны графік візіцёраў быў вельмі шчыльны — адна сустрэча змяняла другую. Упаўнаважаны Германіі па палітыцы ў галіне правоў чалавека і гуманітарнай дапамозе Гюнтэр Наоке паведаміў, што падчас візіту прадстаўнікі дэлегацыі «пачулі розныя меркаванні, што было важна, каб скласці ўласнае ўражанне». «Размова ідзе пра тое, каб ацаніць сітуацыю, наколькі змены, што адбыліся, насамрэч станоўчыя, а не касметычныя, — адзначыў амбудсмен. — Я хачу падкрэсліць, што мы з'ўляемся неафіцыйнай групай. У васьмі з дваццаці сямі дзяржаў ЕС існуе інстытут паслоў па правах чалавека. Па завяршэнні візіту мы зробім справаздачу, якая будзе накіраваная ва ўсе ўрады краінаў Еўрасаюза. Яна будзе мець уплыў, але які дакладна, я пакуль не магу сказаць». Спадар Наоке заявіў, што справаздача будзе «адносна пазітыўная».

Цягам гадзіны за закрытымі дзвярыма з пасламі па правах чалавека размаўлялі прадстаўнікі чатырох апазіцыйных партый Беларусі: БНФ, АГП, сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада), Партыі камуністаў Беларускай. Анатоль Лябедзька паведаміў: «Паслы запэўнілі палітыкаў у тым, што пытанне дэмакратыі застаецца актуальным. Упаўнаважаны па правах чалавека Германіі сказаў, што дыялог з мяккай акцэнтацыяй на правы чалавека — слабы дыялог».

У сакавіку міністры замежных спраў краін Еўрасаюза будуць абмяркоўваць пытанне працягвання часовай адмены ўведзеных супраць Беларусі санкцый. Раней умовай для поўнай адмены санкцый былі дэмакратычныя рэформы і выкананне правоў чалавека.

УЗНАГАРОДА

# АЛЯКСАНДР ТАМКОВІЧ АТРЫМАЎ ПРЭМІЮ ІМЯ ЮРЫЯ ЗАХАРАНКІ

Генадзь КЕСНЕР

**27 лютага ў Мінску адбылося штогадовае ўручэнне прэміі «З адкрытым забралам» імя былога міністра ўнутраных спраў Беларусі генерала Юрыя Захаранкі, гвалтоўна скрадзенага невядомымі 7 мая 1999 года.**


Фота Юрыя Дзядзінкіна

Аляксандар Тамковіч, Алег Волчак, Раіса Міхайлоўская

Сёлета лаўрэатам прэміі, заснаванай пяць год таму незарэгістраваным рухам «Абаронцы Айчыны», стаў вядомы беларускі журналіст і публіцыст Аляксандр Тамковіч.

А на пачатку цырымоніі ўганаравання адзін з кіраўнікоў руху, былы следчы пракуратуры, а цяпер праваабаронца Алег Волчак нагадаў нават не столькі прысутным, колькі чыноўнікам, што 7 мая споўніцца 10 гадоў ад дня знікнення генерала Захаранкі.

«Ужо дзесяць гадоў вядзецца следства, якое перапынялася толькі на тры месяцы. За гэты час змяніліся чатыры следчыя, і за гэты час я, як давераная асоба сям'і Захаранкі, ніякай інфармацыі не атрымаў, акрамя фразаў: «Следства працягваецца, па завяршэнні яго вынікі Вам давядуць да ведама», — распавядае Волчак. — Толькі дзякуючы Камісіі ААН па нядобраахвотных знікненнях, з якой мы перапісваліся, я даведаўся, што следства адпрацоўвала чатыры версіі знікнення Юрыя Захаранкі: першая версія — асабістая непрыязь да кагосьці, другая — эканамічная, трэцяя версія — грамадска небяспечнае хуліганства, якое пацягнула знікненне чалавека, і на чацвёртым месцы стаяла палітычная версія. Беларускае Міністэрства замежных спраў, якое штогод прадстаўляе інфармацыю ў Камітэт ААН па нядобраахвотных знікненнях, неаднаразова ўказвала, што вышэйшыя службовыя асобы не маюць дачынення да знікнення, як не маюць дачынення да гэтага і беларускія спецслужбы».

Па словах Алега Волчака, 8 сакавіка ён будзе выступаць у Камісіі ААН па нядобраахвотных знікненнях, куды атрымаў запрашэнне, дзе яшчэ раз будзе ўздымаць тэму знікнення экс-міністра ўнутраных спраў.

«Мы бачым, як развіваецца дыялог паміж Беларуссю і Еўрапейскім Саюзам, але мы заўважаем, што тэма зніклых адыходзіць усё больш і больш на задні план, — падкрэсліў праваабаронца. — Але я лічу, што тэму зніклых трэба зноў вярнуць на першае месца, бо як можна весці дыялог і перамовы з міністрам унутраных спраў Навумавым, з былым кіраўніком Адміністрацыі прэзідэнта, паслом па асобых даручэннях Шэйманам, калі грамадства не ведае, ці маюць гэтыя людзі дачыненне да знікненняў вядомых людзей, у прыватнасці Юрыя Захаранкі».

Алег Волчак прадэманстраваў прысутным на цырымоніі запіс прэс-канферэнцыі Юрыя Захаранкі адразу пасля таго, як кіраўнік дзяржавы зрабіў у яго адрас некалькі непрыемных выпадаў з рознымі абвінавачаннямі. «Я ўвогуле не мог сабе такога ўявіць, што можна вось так міністра ўнутраных спраў паказаць як нейкага асабліва небяспечнага злачынцу, як нейкае, прабачце мяне, г…., якое не заслугоўвае хоць нейкай павагі, — казаў тады апальны генерал міліцыі. — Так перакрэсліць усё маё прафесійнае жыццё, да такога, канешне, трэба яшчэ дайсці… Калі мы разыходзіліся са спадаром Лукашэнкам, у мяне не было ніякіх чорных думак. Ну што ж, у кожнага свае прынцыпы. Але калі мяне, у прынцыпе, расстралялі перад усім маім народам, я быў у шоку».

Прадстаўляючы новага лаўрэата прэміі імя Юрыя Захаранкі Аляксандра Тамковіча, кіраўнік Цэнтра па правах чалавека Раіса Міхайлоўская нагадала, што ён не проста вядомы журналіст, адзін з кіраўнікоў ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў», але і аўтар чатырох кніг — «Лёсы», «Жанчыны», «Асобы» і «Будзіцелі», прысвечаных вядомым у краіне людзям. У мінулым капітан Аляксандр Тамковіч быў ваенным карэспандэнтам, працаваў у газеце «*Во славу Родины*», якую пакінуў на знак пратэсту падчас жнівеньскага путчу 1991 года. Пасля гэтага Аляксандр Тамковіч быў адным з заснавальнікаў і намеснікам галоўнага рэдактара незалежнай беларускай газеты «*Свободные новости*».

«Аляксандра Тамковіча сапраўды можна назваць будзіцелем — чалавекам, які прасоўвае нашу краіну да лепшай будучыні, да нашых ідэалаў дэмакратыі і справядлівасці», — падкрэсліла Раіса Міхайлоўская.

У мінулыя гады лаўрэатамі прэміі «З адкрытым забралам» былі вядомы юрыст і праваабаронца Гары Паганяйла, генерал Валеры Фралоў, экс-кандыдат у прэзідэнты Беларусі, былы палітвязень прафесар Аляксандр Казулін і Мікалай Аўтуховіч, у недалёкім мінулым прадпрымальнік, воін-афганец, які зараз знаходзіцца ў вязніцы на вуліцы Валадарскага ў Мінску.

*P.S. Зараз Аляксандр Тамковіч знаходзіцца ў Бруселі, дзе 2–4 сакавіка адбылася сустрэча беларускіх экспертаў з прадстаўнікамі структур ЕС і дыпламатычных місій. Там жа прайшла прэзентацыя яго кніг.*

ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# КРЫЗІС ПРЭЗІДЭНЦТВА

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Кажуць, што любы лідэр мусіць падаваць прыклад сваім падначаленым. Асабліва калі сітуацыя крызісная. І кожны падае гэты прыклад, як можа. Лідэры дзяржаў з натхненнем абмяркоўваюць антыкрызісныя праграмы і грошы, якія трэба выдзеліць на падтрымку сусветнай эканомікі. І толькі Аляксандр Лукашэнка паказаў, што грошы трэба не выдзяляць — іх папросту трэба эканоміць.**

На тыдні беларускі прэзідэнт выправіўся правесці шэраг працоўных сустрэч, а заадно і скарыстаць недагуляную частку адпачынку ў Славакію. На гарналыжны курорт. Усе ўзвіліся: як можна, у перыяд крызісу? Але насамрэч мудрасці Аляксандра Рыгоравіча трэба пазайздросціць.

Па-першае, стала вядома, што выправіўся ён туды па асабістаму запрашэнню ўладальніка гатэля «Гранд» бізнесоўца Міядрага Косціча. Менавіта ў гэтым гатэлі спыніўся Лукашэнка і ягоная світа і сямейнікі. Больш за тое, Міядрага Косціча там называюць «цукровым каралём». Таму ўладальніку гатэлю нічога не варта забяспечыць, як кажуць, «пражыванне і харчаванне за кошт прымаючага боку».

Па-другое, нават калі Аляксандр Лукашэнка і заплаціць за нумар — нічога жудаснага. «Камсамольская праўда» ў Беларусі» высветліла, колькі каштуе нумар у гатэлі. «Раней у гатэлях рангам ніжэй за пяць зорак Аляксандр Лукашэнка не спыняўся. Але на горным курорце Капаонік, дзе прэзідэнт катаецца на лыжах у гэтым годзе, гатэляў пяцізоркавага ўзроўню папросту няма. У «Гранд» ёсць нумары за 65 еўра, за 75 і люкс за 120 еўра», — расказалі «Камсамолцы» на рэцэпцыі гатэля. «Цяперашнія сціплыя зімовыя вакацыі прэзідэнта не параўнаць з шыкоўнымі ўмовамі адпачынку 2002 года. Тады Аляксандр Лукашэнка адправіўся ў пяцізоркавы гатэль «Клостэрброй» у Альпах. «Імператарскі с'ют» аўстрыйскага гатэля каштуе 550 еўра з чалавека», — піша выданне.

Гэта ж якая эканомія! Амаль у чатыры разы! А калі ж і зусім «за кошт прымаючага боку», то чаму б і не з'ездзіць? Тым больш, за «недагуляны» адпачынак любому працоўнаму павінна выплачвацца кампенсацыя. Такім чынам, прэзідэнт ратуе і бюджэт Беларусі ад крызісу.

Шкада, што не ўсе ягоныя падначаленыя падтрымліваюць прыклад свайго прэзідэнта. З аднаго боку, прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі нядаўна заяўляў, што ён ужо пяць год піша адной асадкай. Сціплы.

Чаго не скажаш пра лідэра Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Леаніда Козіка, вакол якога разгараецца аўтамабільны скандал.

На месцы прэзідэнта я б, вярнуўшыся з адпачынку, паставіў бы Козіку вымову з занясеннем.

Здаецца, беларускія чыноўнікі могуць скампенсаваць пакуль спрэчнае пытанне яшчэ большага набліжэння да Захаду і даволі хуткага ўступлення ў праграму «Усходняга партнёрства». Бо на гэтым тыдні, пакуль прэзідэнта няма, чыноўнікі стала падрываюць дыялог.

Беларускае МЗС, напрыклад, адмовіла спадарожнікаваму тэлеканалу «Белсат» у рэгістрацыі прадстаўніцтва ў Беларусі. Афіцыйнай прычынай для адмовы стала няправільнае афармленне дакументаў. «Спачатку ў нас месяц не прымалі дакументы, кажучы, што чагосьці не хапае. Потым прынялі і больш за два месяцы разглядалі, а затым адмовілі, заявілі, што неяк не так аформлены дакументы», — сказала дырэктар тэлеканала Агнешка Рамашэўска.

Праўда, МЗС у адказе напісаў, што пасля выпраўлення недахопаў дакументы можна будзе падаць яшчэ раз, але сутнасці гэта не мяняе.

Не адстаў і Мінюст. Ён адмовіў у рэгістрацыі праваабарончаму грамадскаму аб'яднанню «Наша Вясна». Прычым Мінюст ставіць пад сумнеў факт правядзення ўстаноўчага сходу арганізацыі, паколькі памяшканне офіса Аб'яднанай грамадзянскай партыі вельмі невялікае. Якім чынам Мінюст падлічыў плошчу, на якой павінны збірацца заснавальнікі, невядома. Можа, яны там на галовах сядзелі або штабялямі ляжалі, а віцэ-прэзідэнт Міжнароднай Федэрацыі правоў чалавека Алесь Бяляцкі з гаўбца звісаў...

Да заснавальнікаў арганізацыі таксама прад'яўляюцца старыя прэтэнзіі: тое, што некаторыя з іх раней прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці за розныя правапарушэнні — удзел у несанкцыянаваных акцыях, распаўсюджанне выданняў без выхадных звестак і іншае. Нагадаем, што гэтыя прэтэнзіі былі адрынутыя яшчэ 24 чэрвеня 2007 года, калі Камітэт па правах чалавека ААН зрабіў выснову, што сваімі дзеяннямі па ліквідацыі ГА «Вясна» беларуская дзяржава парушыла пункт 1 артыкула 22 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах. Аднак Міністэрства юстыцыі, а затым і Вярхоўны суд Беларусі праігнаравалі рашэнне Камітэта па правах чалавека ААН, і спроба зарэгістраваць грамадскае аб'яднанне «Вясна» ў жніўні 2007 года не прынесла вынікаў. Так што зараз Мінюст ізноў сутыкнецца з ААН.

І на тыдні застаўся за кратамі актывіст міжнароднай моладзевай арганізацыі «Малады фронт» (Чэхія) Арцём Дубскі. Ён змешчаны ў следчы ізалятар у Асіповічах. Рашэнне пра змяшчэнне ў следчы ізалятар маладога чалавека звязана з тым, што ў дачыненні да яго распачата крымінальная справа па артыкуле 415 Крымінальнага кодэкса Беларусі (ухіленне ад адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі).

Арцём Дубскі — адзін з фігурантаў «справы чатырнаццаці». Ён быў прыгавораны да двух гадоў абмежавання волі за ўдзел у акцыі прадпрымальнікаў у студзені 2008 года. І шмат хто лічыць яго палітзняволеным.

У такіх умовах, канешне, трэба разлічваць на сябе, і нічога не застаецца, каб проста эканоміць.

▸ **АД ПЕРШАЙ АСОБЫ**

# Алег Цывінскі: «БЕЛАРУСКАЙ ЭКАНОМІЦЫ НЕАБХОДНА ЛІБЕРАЛІЗАВАЦЦА»

**25 лютага Сусветны эканамічны форум у Давосе абвясціў спіс Маладых лідэраў планеты на 2009 год (Young Global Leaders–2009). Ужо традыцыйна ў такія спісы штогод уваходзяць да 100 самых выбітных эканамістаў, палітыкаў, навукоўцаў, журналістаў, актывістаў НДА, творцаў у веку да 40 гадоў. Абраннікі аўтаматычна далучаюцца да Форуму сусветных лідэраў, заснаванага ў 2004 годзе кіраўніком СЭФ Клаўсам Швабам. Крытэр выбару — прафесіяналізм кандыдатаў у сваёй сферы, прызнанне іх аўтарытэта грамадскасцю, іх патэнцыйная здольнасць спрычыніцца да кшталтавання будучыні планеты. Груба кажучы, у Давосе ўзяліся гадаваць маладыя глабальныя эліты. Сёлета Маладым лідэрам планеты ўпершыню быў абраны грамадзянін Беларусі — выпускнік БДЭУ Алег Цывінскі, прафесар Ельскага універсітэта (ЗША), выбітны спецыяліст па макраэканоміцы. Яшчэ да прызнання на СЭФ ён быў сусветна вядомы як навуковец — уладальнік прэстыжных прэмій, аўтар з высокім рэйтынгам цытаванасці: яго працы друкуюцца ў вядучых эканамічных часопісах планеты. Ведаючы, наколькі неабыякавыя для любога беларуса любыя факты сусветнага прызнання суайчыннікаў, журналіст Марыя Мартысевіч вырашыла крыху распытаць Алега пра яго шляхі да «такога жыцця».**



***— Алег, прыміце віншаванні з нагоды прэстыжнай прэміі. Ці была яна для вас нечаканасцю? Як вам — пачувацца «маладым глабальным лідэрам»?***

— Дзякуй. Зразумела, гэта была нечаканасць. Я ведаў, што намінаваны, але ж і ведаў, што атрымаць прэмію даволі складана. Выбар ідзе сярод 5 тысяч кандыдатаў да 40 гадоў, а мне ўсяго 31, таму было нечакана, што мяне абралі ўжо сёлета: сярэдні век пераможцаў крыху вышэй — год 35–36. Атрымаць прэмію было вельмі прыемна, тым больш прыемна па прычыне, што я першы лаўрэат з Беларусі. Гэта вельмі добра для нашай краіны, бо мы мала прадстаўленыя ў сусветнай эліце, у тым ліку і на СЭФ. Для мяне гэта таксама прызнанне маіх поспехаў і ў акадэмічным плане, і павелічэнне майго аўтарытэту на сусветным узроўні, бо галоўныя крытэры выбару — значныя дасягненні і вялікі патэнцыял. З Кітая, як правіла, абіраюць 5 чалавек, з Расіі — 3, з Украіны — 1, ЗША — 10–15 чалавек. З аднаго боку, прэстыжна, што мяне абралі па квоце ЗША, дзе я працую. У вялікіх краінах канкурэнцыя большая. Сярод іншых прадстаўнікоў Паўночнай Амерыкі ў 2009 годзе — акторка Джэсіка Біл, гулец у гольф Тайгер Вудс, фундатарка дабрачыннай арганізацыі, вынаходнік «Скайпу», уладальнік «Ютубу»... Але я — грамадзянін Рэспублікі Беларусь, таму гэта прэмія — і для Беларусі таксама.

Статус маладога лідэра дае права ўдзельнічаць у Форуме маладых лідэраў. Гэта дадатковая магчымасць камунікавання, магчымасць ствараць супольныя праекты, прасоўваць ідэі, а таксама знаёміцца з ідэямі тых, хто будзе адыгрываць ролю ў розных сферах ужо праз некалькі гадоў. Калі цябе абіраюць, ты вырашаеш, ці хочаш быць актыўным сябрам супольнасці. Актыўных сябраў на сёння — каля 300.

***— У свой 31 год вы — без перабольшанняў — «узыходзячая зорка» сусветнай эканомікі. Людзі, што дасягнулі чагосьці ў жыцці і сталі знакамітымі ўжо ў 25–30 гадоў — сусветная тэндэнцыя. Як вы думаеце, у чым прычына такога «амаладжэння лідэраў»?***

— Я таму і абраў акадэмічную, навуковую дарогу, што ў гэтай галіне можна вельмі імкліва зрабіць кар'еру. Увогуле ж, у сучасным свеце парушыліся ўсе іерархіі: прызнанне твайго поспеху ўжо не залежыць ад тваіх сувязяў, паходжання ці «выслугі гадоў»: толькі твае дасягненні як прафесіянала. Магчыма, менавіта таму маладыя з новымі крэатыўнымі ідэямі дасягаюць поспеху так хутка.

***— Што больш прыцягвае вас у вашай прафесійнай дзейнасці: даследчыцкі кампанент ці выкладчыцкі?***

— Ельскі універсітэт — гэта перадусім даследчыцкі цэнтр, задача якога — выпрацоўваць новыя рашэнні для актуальных працэсаў у свеце. Я тут ачольваю Праграму Макраэканамічных даследаванняў у Інстытуце Коўла, а выкладчыцкіх курсаў у мяне не больш за два ў год. Навука для мяне на першым месцы.

***— Вы і ваш сябар Міхаіл Голасаў былі ці не найлепшымі студэнтамі мінскага наргасу выпуску 1998 года. Пытанне нібыта з прадказальным адказам, але ўсё ж: чаму вы з'ехалі з Беларусі, не прыняўшы прапанову выкладаць на радзіме?***

— Так, я паступіў у аспірантуру ў ЗША, Голасаў вучыўся ў Канадзе... Калі вы хочаце займацца эканомікай на сусветным узроўні, варта вучыцца гэтаму не ў нас, а ў іх. Беларуская, дый расійская эканамічная навука развітыя даволі слаба. (У Расіі выключэнне — Расійская эканамічная школа, дзе рыхтуюць сапраўды моцных магістраў). Атрымліваць навуковую ступень па эканоміцы варта ў найлепшых універсітэтах Амерыкі. Нават у Еўропе сур'ёзнага ўкладу ў развіццё эканамічнай навукі мала — усяго 2–3 салідных цэнтры...

***— Вы вучыліся ў БДЭУ, пасля — ва універсітэце Мінесоты, працавалі ў Гарвардскім і Каліфарнійскім універсітэтах... У чым, на ваш погляд, розніца паміж амерыканскай і беларускай эканамічнай адукацыяй?***

— У амерыканскай сістэме ўпор робіцца на самастойную працу. Прафесар на лекцыі задае тон, апісвае агульныя рэчы. Асноўная праца — па-за класам. У Беларусі на кожную лекцыйную гадзіну прыпадае адна гадзіна самастойнай працы. Калі ж я выкладаю ў амерыканскай ВНУ, на адну лекцыйную гадзіну прыпадае 8–9 гадзін самастойнай працы. Таму курс, на які ў беларускім універсітэце (напрыклад курс макраэканомікі ў наргасе) адводзіцца паўтары гады, у Ельскім універсітэце праходзіцца за няпоўны семестр. Усё нашмат хутчэй. Падругое, адно з самых галоўных адрозненняў: у амерыканскай культуры няма такіх паняццяў, як «шпаргалкі», «спісванне». Гэта фактычна адзінае, за што могуць адлічыць з універсітэта. Шпаргалка — аўтаматычная двойка, нават за адзінкавае спісванне — выключэнне. Тут пашыраны культ самастойнай працы студэнта.

***— Існуе перакананне, што постсавецкая адукацыя дае шырокія, энцыклапедычныя веды ў спецыяльнасці, у той час як амерыканская выхоўвае вузкага спецыяліста: выпускнік інстытута дранікаў няздольны стаць кандыдатам навук па стравах з бульбы...***

— Насамрэч усё наадварот. Напрыклад, калі я паступаў у наргас, я паступаў на факультэт банкаўскай справы. Гэта значыць, у свае 16 год я мусіў абраць, чым буду займацца ў жыцці. У Амерыцы зусім інакш: калі студэнт паступае ва універсітэт, ён паступае ва універсітэт, а не на спецыяльнасць. Толькі на другім ці нават на трэцім курсе ён можа выбраць эканоміку, матэматыку ці медыцыну. Сістэма найлепшых амерыканскіх ВНУ пабудаваная такім чынам: мы не ведаем, што будзе праз 20 год, але мы можам падрыхтаваць студэнтаў, каб з нашай базай ведаў яны самі навучыліся тым рэчам, якія з'явяцца год праз 20. Адукацыя строга непрафесійная. Мы рыхтуем усебакова адукаваных спецыялістаў.

***— Вы — спецыяліст па макраэканамічнай палітыцы. Апошнім часам увага гэтай дысцыпліны засяроджаная на рашэнні праблемы сусветнага крызісу. Ці не было ўручэнне вам прэміі звязана і з гэтым?***

— Апошнім часам роля эканамістаў у свеце ўвогуле значна павялічылася. У звычайны час, каб разумець эканоміку, дастаткова базавай адукацыі ў межах універсітэцкай праграмы. Цяпер усё складаней. Каб нешта разумець у тым, што адбываецца, трэба мець адукацыю на ўзроўні эканамічнай аспірантуры, інакш сусветныя працэсы не зразумець у прынцыпе.

***— Шмат вашай аналітыкі прысвечана наступствам сусветнага крызісу ў Расіі. А ці сочыце вы за падзеямі ў Беларусі? Як вам так званая «беларуская мадэль эканомікі»?***

— Вядома ж, сачу. У прынцыпе, розніца паміж краінамі не вельмі вялікая: на Беларусь і Расію крызіс уплывае, лічы, аднолькава. Беларуская мадэль... Ведаеце, мадэлі эканомікі паўсюль аднолькавыя: што ў Чылі, што ў Расіі, што ў Беларусі. Беларусь у сусветным плане даволі багатая краіна. Мы ўсе разумеем, што эканамічны рост будзе запавольвацца: усе плады, што вісяць нізка, ужо знятыя. Таму трэба будаваць больш лібералізаваную, адкрытую эканоміку. Так, Беларусь расла вельмі хутка — але з нізкага старту. Нядзіўна, што рост Беларусі быў такі высокі. Але цяпер, калі плады эканамічнага росту сабраныя, будзе запавольванне росту. Крызіс б'е па ўсіх краінах. Трэба дзейнічаць, каб працягнуць рост эканомікі.

***— Як простая беларуская абывацелька, я чула, што ў Беларусі крызіс пачаўся пазней — але і працягнецца ён даўжэй. Наколькі гэта адпавядае праўдзе?***

— Відаць, праўда. Працэс выхаду з крызісу залежыць ад таго, наколькі ўвогуле лібералізаваная эканоміка. Эканамісты называюць гэта «працэс стваральнага разбурэння». У лібералізаванай эканоміцы сапраўды, некаторыя фірмы збанкрутуюць. Але найлепшыя застаюцца, адраджаюцца, растуць хутчэй. А эканоміка, менш развітая з гледзішча свабоднага рынку, уступае ў крызіс пазней, але выкарасквaецца даўжэй. Мы бачым гэта на прыкладзе Японіі, якая страціла 10 гадоў эканамічнага росту, бо вырашыла не праводзіць рэструктурызацыі эканомікі. Гэта быў вялікі ўрок эканамічнай лібералізацыі. Калі ў беларускай эканомікі ёсць жаданне працягваць рост, ці хаця б не дапусціць спаду, ёй, безумоўна, неабходна лібералізавацца. І ў рынку працы, і ў рынку капіталу ёсць запас эканамічнага росту, які можна вызваліць.

***— Можаце даць пару эксклюзіўных парадаў для маладых навукоўцаў-эканамістаў у Беларусі?***

— Трэба інтэгравацца ў сусветную эліту: чытаць міжнародныя часопісы, старацца ездзіць на канферэнцыі. Эканоміка — глабальная навука, мы, беларусы, павінны канкураваць не на мясцовым — на планетарным узроўні. У нас добры патэнцыял, шмат таленавітых дзяўчат і хлопцаў, якія могуць нешта значыць у свеце: варта захацець ды прыкласці сур'ёзныя намаганні — і ўсё атрымаецца.

***— Форум маладых лідэраў пакліканы «кшталтаваць будучыню планеты». Якія вашы ідэі па кшталтаванні будучыні?***

— Будучыня планеты залежыць ад эканамічнага росту. За апошнія 20–30 гадоў свет змяніўся. Эканамічны рост у Кітаі і Індыі выцягнуў сотні мільёнаў людзей з галечы. Так што галоўная задача — забяспечыць эканамічны рост. Бягучы крызіс паказвае, наколькі важная для нас усіх эканоміка.

РЭПРЭСІІ

# ВАЎКАВЫСКІ ВУЗЕЛ

Вольга ХВОІН

**2 сакавіка на прэс-канферэнцыі міністр унутраных спраў Уладзімір Навумаў паведаміў журналістам, што бліжэйшым часам Мікалаю Аўтуховічу, Юрыю Лявонаву і Уладзіміру Асіпенку могуць высунуць новыя абвінавачванні. «Ваўкавыскім прадпрымальнікам можа быць прад'яўлены шэраг новых абвінавачванняў у сувязі з падрыхтоўкай цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў», — заявіў міністр. Ён адзначыў, што «гэтая справа не звязана з выбухам 4 ліпеня ў Мінску».**

За развіццём падзей у справе ваўкавыскіх вязняў сочыць, а таксама аказвае неабходную юрыдычную дапамогу сваякам былы следчы, праваабаронца Алег Волчак. Разам з ім мы прагледзелі дакументы па справе, якія знаходзяцца ў адкрытым доступе, а таксама паспрабавалі знайсці тлумачэнне абвінавачванням, якія многія лічаць абсурднымі.

Ужо былыя прадпрымальнікі Мікалай Аўтуховіч, Юрый Лявонаў і Уладзімір Асіпенка былі арыштаваныя 8 лютага ў Ваўкавыску. Затрыманнямі і вобшукамі кіравалі міліцэйскія чыны ў званнях ад капітана да падпалкоўніка, удзельнічалі байцы спецыяльнага падраздзялення «Алмаз». У выніку былі канфіскаваныя лісты прыватнай перапіскі, дакументы, дыскі, сістэмныя блокі кампутараў, мабільныя тэлефоны, а таксама гаспадарчыя прылады і матэрыялы — бляшаная банка з прыпоем у Асіпенкі, скрутак меднага дроту даўжынёй 186 сантыметраў і пяць паляўнічых патронаў (іх уладальнік раней меў дазвол на захоўванне і выкарыстанне паляўнічай стрэльбы) у Аўтуховіча, канцылярскі стэплер і набор для пайкі ў Лявонава.

Паралельна вобшук быў праведзены ў офісе фірмы, дзе Аўтуховіч працаваў кіроўцам. У гаспадыні фірмы Людмілы Парэмскай канфіскавалі візітоўкі, лісты з прыватнай перапіскі, дыскі, sim-карты да мабільных тэлефонаў. 18 лютага Аўтуховічу, Лявонаву і Асіпенку было прад'яўлена абвінавачванне ў падпале дома былога начальніка Ваўкавыскага РАУС. Падпал быў здзейснены яшчэ ў 2005 годзе. Вінаватыя ў ім адбываюць пакаранне. У час, калі разбіралася справа аб падпале, імя Аўтуховіча фігуравала ў справах следства як мяркуемага падбухторшчыка. Але доказаў віны не было, і ўсе абвінавачванні былі зняты.

Праваабаронца падзяліўся іншымі версіямі арышту. За два тыдні да арышту Мікалая Аўтуховіча, Юрыя Лявонава і Уладзіміра Асіпенкі пад Ваўкавыскам быў знойдзены гранатамёт. Ёсць інфармацыя, што


Photo.ByMedia.Net

**Даведка ад Алега Волчака:**
Мікалай Аўтуховіч у 2006 годзе быў асуджаны на тры гады і шэсць месяцаў зняволення з канфіскацыяй маёмасці, а дырэктар фірмы «Ніка-транс» Юрый Лявонаў — на тры гады і пяць месяцаў. Тады суд пастанавіў, што Аўтуховіч з дапамогай Лявонава нібыта ўхіляўся ад выплаты падаткаў, перавозіў пасажыраў і багаж на аўтамабілях таксі, не рэгіструючы камерцыйнай фірмы і не маючы адпаведнай ліцэнзіі. Праваабаронцы лічылі, што справа была надуманая, і насамрэч вязні былі пакараныя за абарону правоў прадпрымальнікаў. У пачатку 2008 года мера пакарання была зменены на абмежаванне волі.

нават затрымалі некага Ларына, які быццам бы меў да зброі дачыненне і калісьці працаваў з Аўтуховічам. Магчыма, следчыя органы пачалі адпрацоўваць версію датычнасці да гэтага факту Аўтуховіча, але ніякіх вочных ставак за гэты час не было. «У мяне ёсць аргументы, якія падаюцца слушнымі і доказваюць, што віны арыштаваных асобаў у падпале ды іншай незаконнай дзейнасці няма, — гаворыць Алег Волчак. — Да «налёта» 8 лютага ніхто з іх не выклікалі ў міліцыю, ніякіх прэтэнзій па гэтай справе не было. На 10 лютага было прызначанае судовае паседжанне, дзе павінна была разглядацца справа пра ўмоўна-датэрміновае вызваленне Аўтуховіча і Лявонава».

«Дакументы пра ўмоўна-датэрміновае вызваленне рыхтуюцца загадзя, — удакладняе праваабаронца, — вывучаецца магчымая датычнасць асобаў да правапарушэнняў. Калі гэтага не было зроблена амаль да суда, значыць рашэнне пра абвінавачванне Аўтуховіча і Лявонава паспешлівае. Да таго ж Мікалай Аўтуховіч, Юрый Лявонаў і Уладзімір Асіпенка апошнім часам не падтрымлівалі блізкіх кантактаў, Асіпенка быў беспрацоўным, Лявонаў і Аўтуховіч працавалі ў розных фірмах».

На днях стала вядома, што супрацоўнікі міліцыі дапыталі ў межах крымінальнай справы, заведзенай па факту спробы падпалу ў ноч з 6 на 7 лютага будынка Камітэту дзяржаўнага кантролю па Гродзенскай вобласці (невядомыя разбілі шкло бутэлькай з нявызначанай сумессю), грамадскага актывіста з Астраўца Івана Крука. Алег Волчак лічыць, што Аўтуховіча, Асіпенку, Лявонава таксама правяраюць на датычнасць да гэтай справы.

Напрыканцы лютага сваякі Юрыя Лявонава, Мікалая Аўтуховіча і Уладзіміра Асіпенкі звярнуліся да кіраўніка следчай групы Кухарчыка дазволіць ім выступаць у якасці абаронцаў у судзе. На гэты крок сваякоў падштурхнула з'яўленне ў дзяржаўных СМІ інфармацыі пра тое, што арыштаваныя ледзь не бандыцкую групоўку стварылі, а пры вобшуках былі знойдзеныя агнястрэльная зброя і выбухоўка. Кухарчык сваякам у магчымасці абараняць інтарэсы родных адмовіў. Алег Воўчак гаворыць, што паводле артыкула 44 Крымінальна-працэсуальнага Кодэкса і артыкула 62 Канстытуцыі Беларусі сваякі маюць на гэта права.

«Следчы спаслаўся на артыкул 44 КПК, аргументаваўшы сваё рашэнне тым, што толькі ў судзе блізкія сваякі маюць права выступаць абаронцамі абвінавачваных. Аднак гэта яго асабістая інтэрпрэтацыя артыкула, які не адмяняе права сваякоў выступаць у якасці абаронцаў абвінавачваных на папярэднім этапе следства», — адзначае праваабаронца. Паводле яго слоў, да матэрыялаў справы не хочуць допускаць сваякоў, бо баяцца галоснасці. Звычайна адвакаты больш асцярожныя ў агучванні інфармацыі, бо не хочуць страціць ліцэнзію на адвакацкую дзейнасць. Сваякам жа баяцца няма чаго.

Алег Волчак ўпэўнены: «Калі б былі законныя падставы, то следства ўжо дало б ясныя тлумачэнні па справе». На мінулым тыдні Упаўнаважаны Федэральнага ўрада Германіі ў Федэральным міністэрстве замежных спраў па палітыцы ў галіне правоў чалавека і гуманітарнай дапамозе Гюнтэр Наоке пасля сустрэчы з прадстаўнікамі МУС Беларусі паведаміў, што яму так і не ўдалося атрымаць вычарпальных фактаў па справе Аўтуховіча, Лявонава і Асіпенкі.

Юрыст праваабарончага цэнтру «Вясна» Валянцін Стэфановіч паведаміў, што праваабаронцы пакуль устрымліваюцца ад прызнання справы Аўтуховіча, Лявонава, Асіпенкі палітычна матываванай. Магчыма, такое рашэнне будзе прынятае пасля судовага працэсу. Юрыст адзначыў, што пакуль занадта мала інфармацыі — як афіцыйнай, так і неафіцыйнай, — каб рабіць нейкія высновы.

«Абвінавачванне мае непалітычны характар. У нас няма ясных аргументаў наконт таго, што справа заведзеная за палітычныя перакананні, — тлумачыць пазіцыю юрыст. — Цяпер складаны перыяд, мы бачым, што заводзіцца шэраг крымінальных спраў на людзей, якія з'яўляюцца актывістамі грамадзянскай супольнасці. Але трэба быць абачлівымі, бо самае горшае, што можа быць, гэта калі дэвальвуецца само паняцце палітвязня». Арганізацыя Amnisty International у сваіх ацэнках займае яшчэ больш жорсткую пазіцыю, і прызнае асобу вязнем сумлення толькі тады, калі чалавек пацярпеў за выказванне сваіх перакананняў. Напрыклад, ніводны чалавек з «працэсу 14-ці» па леташняй справе аб мітынгах прадпрымальнікаў не быў прызнаны вязнем сумлення.

*P.S. Акрамя Мікалая Аўтуховіча, Юрыя Лявонава, Уладзіміра Асіпенкі, пад крымінальным пераследам цяпер знаходзяцца фігуранты «справы 14-ці», якія летась былі асуджаныя за ўдзел у акцыі пратэсту прадпрымальнікаў. Актывіст грамадзянскай кампаніі «Еўрапейская Беларусь» Аляксандр Баразенка быў асуджаны да абмежавання волі тэрмінам на 1 год без накіравання ў выпраўленчую ўстанову, з 27 кастрычніка да 9 снежня 2008 года да суда ён знаходзіўся ў следчым ізалятары часовага ўтрымання. Арцём Дубскі, Аляксей Бондар, Міхаіл Крываў, Міхаіл Пашкевіч, Аляксандр Стральцоў, Аляксандр Чарнышоў, Таццяна Цішкевіч, Міхаіл Субоч і Павел Вінаградаў былі асуджаныя да абмежавання волі на 2 гады без накіравання ў адмысловыя ўстановы для адбыцця тэрміна.*

*Максім Дашук як непаўналетні атрымаў паўтара гады абмежавання волі. Усе гэтыя асобы фактычна знаходзяцца пад хатнім арыштам і за любое парушэнне могуць быць прыцягнутыя да крымінальнай адказнасці — пазбаўленыя волі.*

*Ужо прад'яўлена абвінавачванне па артыкуле 415 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь за ўхіленне ад адбывання пакарання Максіму Дашуку. Было зафіксавана пяць парушэнняў ім парадку адбывання пакарання. Максім сцвярджае, што ў сувязі са складаным фінансавым становішчам у сям'і дапамагае маці на працы. Але калі чалавек, асуджаны да такога пакарання, не знаходзіцца ў вызначаны час дома, гэта падстава лічыць ухіленнем ад адбыцця пакарання. Аналагічная крымінальная справа па артыкуле 415 Крымінальнага кодэкса заведзеная на Арцёма Дубскага. Цяпер ён знаходзіцца ў СІЗА.*

*Таццяна Цішкевіч навучаецца ў Польшчы, а калі вернецца ў Беларусь, то міліцыя мае падставы яе арыштаваць за парушэнне вышэйназванага артыкулу Крымінальнага кодэкса. Пакаранне прадугледжвае ад шасці месяцаў да трох гадоў турмы.*

*Фармальна, Дашука, Дубскага, Цішкевіч можна прыцягнуць да адказнасці. Але паўстае пытанне: наколькі справядлівым і абгрунтаваным быў прысуд за ўдзел у акцыях пратэсту прадпрымальнікаў? І калі ён выклікае сумневы, то з этычнага боку паўстае пытанне мэтазгоднасці выканання ўмоў рашэння суда.*

## ЗАЯВА КААРДЫНАЦЫЙНАЙ РАДЫ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПРАДПРЫМАЛЬНІКАЎ БЕЛАРУСІ

18 лютага 2009 года лідэрам прадпрымальніцкага руху М. Аўтуховічу, Ю. Лявонаву, У. Асіпенку было прад'яўлена абвінавачанне па артыкуле 218 Крымінальнага кодэкса, і іх пакінулі за кратамі. Зусім нядаўна мы радаваліся вызваленню палітвязняў, у тым ліку выхаду на волю нашых калегаў-прадпрымальнікаў Мікалая Аўтуховіча і Юрыя Лявонава. Толькі павагу маглі выклікаць мужнасць, адказнасць, прынцыповасць гэтых людзей, якія, нягледзячы на ціск сілавых структураў, занялі актыўную грамадскую пазіцыю ў абароны незалежнасці і дэмакратыі ў Беларусі.

Нашы ваўкавыскія калегі дапамагалі наладжваць працу Каардынацыйнай рады індывідуальных прадпрымальнікаў, адным з лідэраў якой з'яўляецца Мікалай Аўтуховіч. Мы добра ведаем М. Аўтуховіча, Ю. Лявонава, У. Асіпенку па сумеснай дзейнасці ў абароны правоў прадпрымальнікаў і адказна заяўляем, што іх пераслед носіць не крымінальны, а палітычны характар. Мы выказваем абурэнне пераследам уладамі нашых калег. Мы салідарныя з Мікалаем, Юрыем і Уладзімерам і іх сем'ямі. Не разумеем безадказнасці ўладаў, якія дапусцілі з'яўленне новых палітзняволеных, цудоўна разумеючы, што гэта можа прывесці да далейшай ізаляцыі Беларусі і пагаршэння адносінаў з міжнароднай супольнасцю.

Сённяшні рэжым зноў узяў закладнікаў дзеля застрашвання беларускага грамадства. Мы патрабуем неадкладнага вызвалення М. Аўтуховіча, Ю. Лявонава, У. Асіпенкі і спынення супраць іх крымінальнай справы. Мы заклікаем усіх людзей добрай волі зрабіць усе магчымае, каб дамагчыся вызвалення палітвязняў.

▸ ЭКСПЕРТЫЗА

# АД ЭКАНАМІЧНАГА КРЫЗІСУ ДА КРЫЗІСУ САЦЫЯЛЬНАГА

Сяргей НІКАЛЮК

**Любое агульнае паняцце пры жаданні можна вытлумачыць па-рознаму — тут шмат што залежыць ад кантэксту і ад асобы тлумачальніка. Паняцце «крызіс» не з’яўляецца выключэннем. Для таго, каб у гэтым пераканацца, дастаткова перачытаць заявы вышэйшых беларускіх чыноўнікаў.**



Працытую, да прыкладу, віцэ-прэм’ера Андрэя Кабякова: «Сітуацыя ў эканоміцы Беларусі стабільная, хоць і няпростая». Як гэта разумець? У краіне ўжо некалькі месяцаў запар скарачаюцца прамысловая вытворчасць і экспарт. Ці варта разглядаць гэтыя стабільныя скарачэнні ў якасці паказчыку агульнай эканамічнай стабільнасці або, наадварот, у якасці паказчыку няпростай сітуацыі?

Задаваць падобныя пытанні самому сабе можна бясконца, аднак для эканамістаў, у адрозненне ад іншых прадстаўнікоў гуманітарных навук, крызіс — паняцце, якое паддаецца інструментальнаму вымярэнню. Калі ВУП устойліва расце, ёсць усе падставы казаць пра эканамічны росквіт, а заадно і пра правільна абраны курс. Калі ж ВУП скарачаецца — гэта крызіс.

У краінах, дзе склаліся эканамічныя традыцыі, для канстатацыі эканамічнага крызісу выкарыстоўваюцца дадатковыя макраэканамічныя паказчыкі. Так, у ЗША афіцыйным правам канстатаваць пачатак крызісу надзелены Камітэт па азначэнні тэрмінаў дзелавога цыкла Нацыянальнага бюро эканамічных даследаванняў. У дапаўненне да паказчыку ВУП, што разлічваецца ў квартальным рэжыме, Камітэт улічвае рэальныя даходы насельніцтва, занятасць, прамысловую вытворчасць, аптовыя і рознічныя продажы. Для пацвярджэння пачатку крызісу неабходна наяўнасць адмоўных тэмпаў прыросту для ўсіх пералічаных паказчыкаў адначасова.

Аднак пяройдзем цяпер ад эканомікі да сацыялогіі — навукі, што таксама не пазбаўлена схільнасці да вымярэнняў. Зусім не выпадкова ў Еўрасаюзе існуе праграма «Еўрабарометр», сама назва якой намякае на магчымасць вымяраць сацыяльныя настроі. Для такіх вымярэнняў існуе набор стандартных пытанняў. Найбольш папулярнымі з’яўляюцца пытанні пра змену матэрыяльнага становішча рэспандэнтаў за апошнія тры месяца і пра змяненне сацыяльна-эканамічнай сітуацыі ў краіне ў найбліжэйшыя гады. Абодва пытанні прадугледжваюць аднолькавы набор адказаў: «палепшылася», «пагоршылася» і «не змянілася».

Калі ад аптымістычных значэнняў адказаў адкінуць песімістычныя, то мы атрымаем некаторыя індэксы, якія дазваляюць вымяраць сацыяльную тэмпературу. У першым выпадку гэта будзе індэкс матэрыяльнага становішча (ІМС), а ў другім — Індэкс чаканняў (ІЧ). Калі абодва індэкса маюць адмоўныя значэнні, то мы можам смела сцвярджаць наяўнасць у краіне сацыяльнага крызісу.

Абгрунтаванасць дадзенага сцвярджэння зразумелая і на побытавым узроўні. Бо адмоўны ІМС значыць, што колькасць грамадзян, якія адзначылі пагаршэнне свайго становішча за апошнія тры месяца, большая за колькасць тых, што казалі пра



У Беларусі палітыка зведзеная да разборак «пад дыванам», якімі занята вузкае кола абмежаваных людзей. Сацыёлагі са сваімі анкетамі тут бездапаможныя

паляпшэнне. У сваю чаргу, адмоўнае значэнне ІЧ сведчыць пра перавагу ў грамадстве трывожных чаканняў. Практыка шматгадовых назіранняў паказвае, што ва ўмовах устойлівага эканамічнага росту, калі выключыць часавыя флуктуацыі, звязаныя з надзвычайнымі сітуацыямі кшталту нафтагазавых разборак, сума індэксаў станоўчая. Наадварот, адмоўная дынаміка ВУП непазбежна змяняе яе знак.

## Да дна яшчэ далёка

Перш чым разглядзець дынаміку індэксаў за два апошнія гады, адзначым, што, нягледзячы на іх выяўляную ўзаемазалежнасць, ІМС у першую чаргу рэагуе на змены, якія адбываюцца ў паўсядзённай рэальнасці, а ІЧ — на паведамленні СМІ і чуткі. Звернемся да табліцы 1. Максімальнае значэнне ІМС было зафіксавана ў год трэціх прэзідэнцкіх выбараў. Нічога дзіўнага ў гэтым няма. Па традыцыі, якая склалася ў Беларусі, менавіта на такія гады прыходзіцца пік сацыяльных выплат. У гэтыя ж гады дзяржаўнымі СМІ праводзіцца магутная мабілізацыйная кампанія, што і зафіксаваў ІЧ. Калі меркаваць па розніцы лістападаўскіх індэксаў, інфармацыйныя «пернікі» былі істотна саладзейшымі за пернікі рэальныя.

Праз два месяца распачалася беларуска-расійская нафтагазавая вайна. Для грамадзян яна была віртуальнай, таму ІМС знізіўся мала, чаго не скажаш пра яго «калегу», які літаральна абваліўся. У лістападзе-снежні 2007 года здарылася новая навала: нечакана ўзраслі кошты на прадукты харчавання. Гэты факт не мог застацца незаўважаным, што і зафіксавалі абодва індэкса, але ў першую чаргу ІМС.

Рэакцыю насельніцтва на няпростую эканамічную стабільнасць (узгадаем прыведзеную вышэй цытату А. Кабякова) чытач здольны ацаніць самастойна. Абодва індэкса абваліліся, прычым ІЧ адразу на 36 пунктаў.

Чуткі, як гэта часта бывае, апынуліся мацней за дзяржаўны агітпроп. «Крызісу ў Беларусі няма». Гэтую думку ў рэспубліцы ўжо ў пачатку снежня (час правядзення апытання) падзялялі, мабыць, толькі тыя, каму гэта неабходна было рабіць па пасадзе. Для астатніх жа крызіс эканамічны перайшоў у крызіс сацыяльны. Зразумела, што яшчэ не вечар, і крызіс крызісу розніца. У снежні 1996 года значэнні ІМС і ІЧ склалі адпаведна –52,6 і –53,6.

Такім чынам, да дна сацыяльнага крызісу нам яшчэ падаць і падаць. Гэту выснову пацвярджаюць і адказы на пытанне: «Калі казаць пра жыццё Вашай сям’і, якія мэты Вы і Вашы сваякі ставіце перад сабой?» (табліца 2). Параўнанне адказаў у першай і другой калонках пераканаўча паказвае, што пачатак крызісу не прывёў да змены жыццёвых стратэгій беларусаў. Колькасць тых, хто імкнецца проста выжыць, не змянілася. Такім чынам, сацыяльны ліфт яшчэ не пачаў слізгаць уніз, пераносячы пры гэтым сваіх пасажыраў на ніжэйшыя ўзроўні спажывання.

## Тэфлонавы рэйтынг

Спароджаны эканамічным крызісам, яго сацыяльны двайнік здольны пры пэўных умовах прывесці да крызісу палітычнага. Здавалася б, для яго вымярэння можна дзейнічаць па аналогіі і ў чарговы раз звярнуцца за дапамогай да вынікаў сацыялагічных апытанняў. Але перш чым так зрабіць, варта выразна вызначыцца з самім паняццем «палітыка». На Захадзе палітыка — гэта сфера самастойных дзеянняў, выбару мэтаў, канкурэнцыі праграмаў і лідэраў, іх падкантрольнасці і адказнасці за зробленыя крокі. Але такой палітыкі ў Беларусі няма і ніколі не было. У Беларусі палітыка зведзеная да разборак «пад дыванам», якімі занята вузкае кола абмежаваных людзей. Сацыёлагі са сваімі анкетамі тут бездапаможныя.

Спроба разглядаць палітыку праз прызму адносін электарату да ўлады на першы погляд здольная паправіць становішча, але і тут неабходна сем разоў адмераць, перш чым сфармуляваць высновы, якія адпавядаюць рэальнасці хоць бы ў першым набліжэнні. Ва ўмовах мэтанакіравана створанай безальтэрнатыўнасці электаральны рэйтынг «адзінага палітыка» робіцца тэфлонавым і на бягучыя перапады грамадскай думкі рэагуе досыць млява. Патрабуюцца час і рэальнае змяненне ўзроўню жыцця, каб такая рэакцыя ўзнікла.

У табліцы 3 электаральны рэйтынг кіраўніка дзяржавы прыведзены да сярэдняга значэння за год. Залежнасць рэйтынгу ад змены рэальных даходаў насельніцтва пры гэтым досыць прыкметная. Аднак за часавы прамежак, што падзяляе два апошніх апытання, прэзідэнцкі «тэфлон» выстаяў, і паніжэнне рэйтынгу не адбылося. У пэўнай ступені гэтаму спрыяў міф пра нібыта знешнюю крыніцу беларускіх эканамічных праблем. Дзяржаўныя СМІ ў гэтым плане папрацавалі вельмі прадуктыўна.

Апошняя выснова, здавалася б, не стасуецца з прыведзеным вышэй сцвярджэннем з нагоды няздольнасці дзяржаўных СМІ ўтрымаць індэкс чакання ад падзення. Падобныя супярэчнасці падчас сацыялагічных апытанняў фіксуюцца рэгулярна. Грамадская думка даволі часта сама апынаецца тэфлонавай і не рэагуе на досыць выразныя знешнія сігналы, а часам жа яна нечакана лёгка паддаецца паніцы. З кожным падобным выпадкам варта разбірацца асобна, але агульнае правіла заключаецца вось у чым: людзі з інфармацыйнай плыні (не істотна, генеруецца яна СМІ або чуткамі) у першую чаргу вылучаюць тое, што пацвярджаецца прадстаўленнямі, якія ўжо склаліся ў іх галовах. У прыватнасці, успаміны пра страту збераджэнняў у пачатку 90-х у грамадскай памяці яшчэ не сцерліся. Яны і робіць беларусаў такімі палахлівымі, увесь час падсілкоўваючы трывожныя чаканні, што і адлюстроўваецца ў дынаміцы індэксаў.

**ТАБЛІЦА 1.** ДЫНАМІКА ІНДЭКСА МАТЭРЫЯЛЬНАГА СТАНОВІШЧА І ІНДЭКСА ЧАКАННЯЎ

| | 11’06 | 01’07 | 05’07 | 09’07 | 12’07 | 03’08 | 06’08 | 10’08 | 12’08 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| ІМС | 8,2 | 4,5 | –3,1 | 1,0 | –21,6 | –9,3 | –6,2 | –5,4 | –21,4 |
| ІЧ | 31,8 | –5,0 | –3,9 | 6,8 | –5,3 | 3,8 | 9,6 | 12,0 | –24,0 |

**ТАБЛІЦА 2.** ДЫНАМІКА АДКАЗАЎ НА ПЫТАННЕ: «КАЛІ КАЗАЦЬ ПРА ЖЫЦЦЁ ВАШАЙ СЯМ’І, ЯКІЯ МЭТЫ ВЫ І ВАШЫ СВАЯКІ СТАВІЦЕ ПЕРАД САБОЙ?», %

| Варыянт адказу | 12’07 | 12’08 |
|---|---|---|
| Выжыць, хай і на самым прымітыўным узроўні існавання | 13,2 | 12,1 |
| Жыць не горш за большасць сем’яў у Вашым горадзе, раёне | 48,8 | 45,3 |
| Жыць лепш за большасць сем’яў у Вашым горадзе, раёне | 18,5 | 20,2 |

На думку назіральнікаў, зацікаўленасць Лукашэнкі ў набліжэнні да Еўропы тлумачыцца выключна растучай залежнасцю ад крэдытаў і энергетычных рэсурсаў Расіі. Беларусь спрабуе хоць нейкім чынам захаваць частку сваёй самастойнасці.

**«Deutche Welle» (Германія)**

Беларускія аналітыкі неаднаразова казалі пра тое, што ў краіне адбываецца не лібералізацыя, а яе імітацыя, каб атрымліваць крэдыты ад міжнародных арганізацый і прываблівацъ інвестараў. Дарэчы, аналагічнай думкі прытрымліваюцца палітолагі і палітыкі, якія ставяць адзнаку працэсам дэмакратызацыі ў Беларусі. Стаўка ў дадзеным выпадку — уступленне Беларусі ў праграму «Усходняе партнёрства» і атрыманне еўрапейскай фінансавай дапамогі. І першыя і другія падчас сустрэч з еўрапейскімі чыноўнікамі спрабуюць пераканаць тых, што ніякай рэальнай лібералізацыі і дэмакратызацыі няма. Больш таго, метады дзяржаўнага кіравання і палітычнага ціску «заганяюцца ўглыб і становяцца больш вытанчанымі».

**«Независимая газета» (Расія)**

Беларусь наўрад ці стане часткай патэнцыйнай антырасійскай прасторы, якая ствараецца ў межах былой Рэчы Паспалітай. У Беларусі толькі пачалося фармаванне самастойнай палітыкі. Яна хацела б стаць мостам паміж Захадам і Еўропай — няхай ім і стане. Аднак поўны сыход на Захад цяпер малаверагодны. Аднак рана рабіць нейкія высновы. Ідзе перамоўны працэс. Што тычыцца прызнання Абхазіі і Паўднёвай Асеціі, то цалкам верагодна, што яго не будзе. Гэта будзе залежаць ад таго, як Лукашэнка дамовіцца з Расіяй.

**«Regnum» (Расія)**

Праўда, у Еўрасаюзе дакладна не ведаюць, што ў галаве беларускага лідэра, наколькі цяжка з ім весці перамовы і як складана будаваць з ім адносіны. Палітыка маятніку, калі Мінск сябруе то з Захадам, то з Масквой — фірмовы стыль беларускага лідэра. І ЕС павінна пераканацца ў гэтым на ўласным вопыце. Для далучэння Беларусі да «Усходняга партнёрства» ёсць адна перашкода: Брусель будзе патрабаваць трансфармацыі беларускага палітычнага рэжыму і адназначнага геапалітычнага выбару. У гэтым сэнсе патрабаванне не прызнаваць Абхазію і Паўднёвую Асецію — першы званок для Мінска. Аднак Лукашэнка ўсімі сіламі намагаецца пазбегнуць залежнасці ад любога партнёра. Так што ва «Усходняга партнёрства» ёсць шанец ператварыцца ў аналаг расійска-беларускай інтэграцыі з яе бясконцымі заявамі аб сяброўстве пры адсутнасці канкрэтных крокаў.

**«Эксперт» (Расія)**

Што стаіць за планамі Юшчанкі і Лукашэнкі? Можа, еўрапейскія чыноўнікі ўжо паабяцалі Лукашэнку, што яго краіна будзе сябрам праграмы «Усходняе партнёрства», якая накіравана на ўключэнне ў еўрапейскую арбіту постсавецкіх краін. Магчыма не выпадкова Лукашэнка ў мінулым годзе так змяніўся, прыкладаўшы максімум намаганняў, каб пазбавіцца іміджу антызаходняга палітыка. Адказ на гэтыя пытанні відавочны. Паводзіны нашых братэрскіх рэспублік нагадваюць паводзіны малодшых братоў, якія жадаюць скласці новую асобную сям'ю.

**«Санкт-Петербургские Ведомости» (Расія)**

У першым выпадку Мінск рызыкуе не трапіць у праграму «Усходняе партнёрства» і зноў трапіць пад санкцы ЕС, у другім — пазбавіцца субсідый з боку Расіі (нізкія кошты на газ, льготны доступ да расійскіх рынкаў). З улікам таго, што краіна рыхтуецца да прэзідэнцкіх выбараў, здаецца, гэты выбар будзе мець вялікі ўплыў на далейшае развіццё палітычнага рэжыму ў Беларусі і геапалітычнай сітуацыі ў Еўропе.

**«Комментарии.ру» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ




### ЗША: АМЕРЫКАНСКІЯ МУСУЛЬМАНЕ ШЧАСЛІВЫЯ

Вядомае сацыялагічнае агенцтва «Gallup» арганізавала спецыяльнае апытанне, каб скласці сацыялагічны партрэт амерыканскіх грамадзян — прыхільнікаў ісламскай канфесіі. У ЗША пражывае 300 тысяч мусульман. Вынікі даследавання дастаткова цікавыя. Напрыклад, амерыканскія мусульманкі ў большасці маюць вышэйшую адукацыю. Палітычныя погляды ў амерыканскіх мусульман падобныя на погляды яўрэяў: палова галасуе за дэмакратаў, траціна — за незалежных кандыдатаў, іншыя — за рэспубліканцаў. Па сацыяльнаму статусу яны належаць да верхняй часткі сярэдняга класа. Самае цікавае, што абсалютная большасць мусульман лічыць сябе шчаслівымі. Па гэтаму паказніку Штаты саступаюць толькі Саудаўскай Аравіі і Германіі. І гэта пры тым, што абсалютная большасць апытаных вернікаў ісламу лічыць сябе выключаным з эліты грамадства за свае рэлігійныя погляды.

**Па матэрыялах «International Herald Tribune» (ЗША)**



### ГЕРМАНІЯ: ЗА АДМАЎЛЕННЕ КАМЕР – У КАМЕРУ

Германія распачала крымінальную справу супраць скандальнага святара Рычарда Вільсана. Падстава — ягоныя заявы наконт таго, што яўрэі не былі ахвярамі газавых камер у часы другой сусветнай вайны. Менавіта такую заяву 69-гадовы святар зрабіў у мінулым годзе ў інтэрв'ю шведскаму каналу падчас семінару, які адбываўся пад Мюнхенам. Адпаведна нямецкім законам, адмаўленне Халакосту лічыцца крымінальным злачынствам. Міністр юстыцыі ФРГ Брыгіта Цыпрэс афіцыйна заявіла пра распачынанне крымінальнай справы супраць антысеміта. Адпаведна еўрапейскім законам, паліцыя Брытаніі, дзе жыве Вільсан пасля яго дэпартацыі з Аргенціны, павінна арыштаваць падазраванага ў злачынстве. Між тым, на мінулым тыдні святар публічна папрасіў прабачэння за свае антысеміцкія заявы, аднак было ўжо занадта позна.

**Па матэрыялах «Guardian» (Вялікабрытанія)**

### ТУРЦЫЯ: КУРДСКАЯ МОВА – ВЫКЛЮЧНА ДЛЯ ЭЛІТЫ

Дзіўная сітуацыя склалася вакол пытання ўжывання курдскай мовы ў Турцыі. Адпаведна закону, адзіная афіцыйная мова ў краіне — турэцкая. Якраз са спасылкай на гэты артыкул канстытуцыі на днях пракуратура ўзбудзіла крымінальную справу супраць Ахмета Цюрка, старшыні курдскай партыі, які размаўляў з дэпутатамі сваёй фракцыі ў парламенце на матчынай мове. Тым больш прэцэдэнт быў: у 1991 годзе іншы курдскі палітык, Лейла Зана, сказала з парламенцкай трыбуны некалькі сказаў па-курдску і атрымала дзесяць гадоў турмы. Аднак на мінулым тыдні закон аб статусе турэцкай мовы парушыў сам кіраўнік ураду. На адным з выбарчых мітынгаў у горадзе, дзе пераважна жывуць курды, ён звярнуўся да выбаршчыкаў на іх мове. Аднак яго, натуральна, ніхто ў пракуратуру не выклікаў. Праблема з курдскай мовай яшчэ больш ускладнілася, паколькі нядаўна пачаліся трансляцыі дзяржаўнага тэлебачання на курдскай мове. Праўда, галоўнае пасланне каналу — галасуйце за кіруючую ў краіне партыю Эрдагана. Усё гэта дало падставу Ахмету Цюрку іранічна заўважыць: «Курдская мова забароненая для курдаў, аднак дазволеная для ўладаў».

**Па матэрыялах «Tageszeitung» (Германія)**

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ФУТБОЛУ НЕ БУДЗЕ?

*Алег ПЯТРОЎ*

**3–4 сакавіка ў Варшаве адбылася канферэнцыя УЕФА, у кулуарах якой шапталіся пра тое, што ў палякаў і ўкраінцаў забяруць права праводзіць чэмпіянат Еўра–2012.**




Фармальна канферэнцыя была прысвечана праблеме праяваў расізму на стадыёнах. Дзякуючы гэтаму для журналістаў і грамадзянскіх актывістаў, якія працуюць у гэтай сферы, была выдзеленая спецыяльная квота. Скарыстаўшыся гэтай квотай, можна было зазірнуць у самае святое міжнароднага футбольнага апарату.

Еўрапейскія футбольныя чыноўнікі — вельмі цікавыя людзі. Напрыклад, нягледзячы на свой салідны ўзрост, яны як дзеці радуюцца футбольным сувенірам кшталту вымпелаў, календароў, значкаў і г.д. А яшчэ еўрапейскія футбольныя чыноўнікі дзеляцца на дзве катэгорыі: еўрапейскія і ўсходнееўрапейскія. Першыя яшчэ неяк намагаюцца пасаваць крытэрыям здаровага ладу жыцця, які быццам прапагандуе УЕФА. Яны падцягнутыя і дынамічныя. Выхадцы з былога ўсходняга блоку нагадваюць бюракрата Агурцова са стужкі «Карнавальная ноч» — мажныя, апранутыя ў гарнітуры мышынага колеру, з дзіўнай традыцыяй абдымацца пры сустрэчах. Дарэчы, на канферэнцыі прысутнічаў дэлегат Еўрапейскай футбольнай лігі геяў і лесбіянак, аднак спартовыя функцыянеры чамусьці не дарылі яму свае пацалункі і абдымкі.

Пасля абдымкаў чыноўнікі звычайна разыходзіліся: заходнікі — за свае сталы, усходнія еўрапейцы — за свае. Падсеўшы да братоў-славян, можна было пачуць шмат чаго цікавага. Напрыклад, пра стан падрыхтоўкі Украіны і Польшчы да чэмпіянату Еўропы 2012 года.

Права праводзіць турнір Кіеў і Варшава, нагадаю, атрымалі ў 2006 годзе. Пры гэтым нават Мішэль Плаціні — кіраўнік УЕФА — не хаваў, што ні першая, ні другая краіна не былі на той момант гатовыя да правядзення мерапрыемства. Права праводзіць турнір называлі «дапамогай у развіцці».

Прайшло амаль тры гады. Яшчэ столькі ж засталося да чэмпіянату, аднак чым далей, тым сітуацыя ўсё больш не зразумелая і інтрыгуючая.

Чыноўнік польскай федэрацыі футбола (PZPN) скардзіцца свайму ўкраінскаму калегу: «Не паспеем, ты ж бачыў, якія ў нас дарогі». Яго суразмоўца не знаходзіць нічога лепш, чым прызнаць, што ва Украіне дарогі яшчэ горшыя. Прыкладна па такой схеме ідзе размова пра стан гатоўнасці стадыёнаў у гарадах, якія будуць прымаць гульні. З чатырох стадыёнаў пакуль не гатовы ніводны. Сярод праектаў, дарэчы, і стадыён, які плануецца пабудаваць на месцы вядомай кожнаму ўсходняму еўрапейцу барахолкі, якая так і называецца — «Стадыён».

Праўда, у параўнанні з Украінай сітуацыя ў Польшчы проста цудоўная. Ужо анекдатычнай стала гісторыя вакол рэканструкцыі Алімпійскага стадыёну ў Кіеве. Якраз насупраць галоўнага выхаду стаяць карпусы новага гандлёвага цэнтру, што супярэчыць усім правілам бяспекі. Некалькі разоў дэлегацыі УЕФА, якія наносілі візіт у Кіеў, патрабавалі пачаць іх дэмантаж. Украінцы кожны раз абяцалі, аднак нічога не рабілі. Закончылася эпапея вельмі празаічна. Былы ўладальнік дзялянкі прадаў яе родзічу Балогі (кіраўнік прэзідэнцкай адміністрацыі Кіева). Той, у сваю чаргу, пагадзіўся прадаць яе муніцыпалітэту за астранамічную суму.

Чым больш пазнаеш чыноўнікаў ад спорту з Усходняй Еўропы, тым больш разумееш, што УЕФА, калі прымала рашэнне пра месца правядзення Еўра–2012, не ўзяла пад увагу асаблівасці калектыўнай этыкі і псіхалогіі насельніцтва гэтага рэгіёну.

Гэту думку добра сфармуляваў адзін з сяброў PZPN, калі тлумачыў прэсе, дзе падзеліся 2,7 мільёна еўра, якія таямніча зніклі з бюджэту ягонай арганізацыі (гэты скандал у мінулую восень каштаваў старшыні федэрацыі працоўнага месца). «У Польшчы карупцыя прысутнічае не толькі ў футболе. Нават доктар кладзе частку грошай за аперацыю сабе ў кішэню. Аднак мы не звальняем міністра аховы здароўя», — сказаў чыноўнік.

Як не парадаксальна гучыць, адзінае, што можа выратаваць Еўра–2012, гэта цяперашні эканамічны крызіс. З-за стагнацыі гаспадаркі з Захаду на радзіму вяртаюцца палякі — працоўныя эмігранты. Падобны працэс адбываецца і ва Украіне. Беспрацоўе мусіць штурхаць людзей ісці нават на такія не вельмі прэстыжныя прафесіі, як будаўнік на стадыёнах або пракладчык аўтатрас да спартовых аб'ектаў. Аднак тут таксама патрэбная воля кіраўнікоў краін.

Не будзем забываць таксама, што тэма Еўра–2012 звязаная ў Польшчы і Украіне з вялікай палітыкай. Калі партыі, якія цяпер знаходзяцца пры ўладзе, не забяспечаць людзям вялікі футбол, іх адразу чакае палітычная смерць.

Так ці інакш, немцы ўжо пачалі разглядаць план выратавання Еўра–2012. Калі Варшава і Кіеў не дадуць рады, Берлін, Дрэздэн, Лейпцыг і іншыя гарады ФРГ гатовыя будуць прыняць турнір. Відавочна, што гэта будзе катастрофа не толькі для Кіева і Варшавы, аднак і для ўсёй Усходняй Еўропы, уключаючы Беларусь. Факт адсутнасці візавага рэжыму з Украінай, адносная геаграфічная блізасць Львова, Харкава і Кіева садзейнічалі б масавым выездам грамадзян РБ на Еўра–2012. Наступствам выбуху цікавасці да футболу звычайна становіцца прыход у спорт моладзі, інвестыцыі ў інфраструктуру.

Зрэшты, каму як. Мая знаёмая варшавянка, пачуўшы пра праблемы Еўра–2012, вельмі ўзрадавалася. Цяпер не трэба будзе бегчы з гораду, які ў выпадку правядзення чэмпіянату абавязкова акупуюць натоўпы п'яных і хуліганістых фанатаў.



Як не парадаксальна гучыць, адзінае, што можа выратаваць Еўра–2012, гэта цяперашні эканамічны крызіс

ГЕАПАЛІТЫКА

# РЭЖЫМ НА ЭКСПАРТ

Алег НОВІКАЎ

**Кітайская мадэль можа стаць глабальнай. Нягледзячы на эканамічны крызіс, Кітай пачаў пашыраць ідэйны ўплыў на краіны Трэцяга свету.**

Мова перш за ўсё пра вояж прэзідэнта КНР Ху Цзіньтао, які ён зрабіў у лютым па краінах Афрыкі. Яго турне можна параўнаць з візітам Дзеда Мароза. Кожнай краіне, якая ляжала на шляху турне, нешта перапала. Сенегал атрымаў 99 мільёнаў долараў у якасці разавай дапамогі. Кіраўніцтву Малі кітайцы паабяцалі пабудаваць новыя мост, шпіталь і прэзідэнцкі палац. Маўрытаніі выдалі крэдыт у 250 мільёнаў долараў на будаўніцтва новага аэрапорту. У Танзаніі кітайцамі будзе пабудаваны новы стадыён, да таго ж краіна атрымае 22 мільёна долараў.

Такая палітыка кідання грашыма можа здавацца дзіўнай. Тым больш, што згаданыя краіны цяжка аднесці да краёў, багатых на карысныя выкапні. Сакрэт у тым, што Пекін цяпер зацікаўлены не толькі ў рэсурсах. Лідэры кітайскай кампартыі мараць пра экспарт і распаўсюджанне сваёй эканамічнай і палітычнай мадэлі. «Стратэгія гарманічнага мірнага развіцця» — так называюць мадэль самі кітайскія місіянеры. Пры гэтым ім не важная арганізацыйная структура або ідэйныя забабоны кіруючай наменклатурнай эліты. Гэта можа быць як партыя, так і звычайны клан або вайсковая хунта.

У краінах Захаду падобная мадэль была б успрынята са скепсісам. Аднак у Афрыцы і Лацінскай Амерыцы яна выклікае зацікаўленасць. Сакрэт фокусу вельмі просты: у адрозненні ад заходніх краін, якія ў абмен на дапамогу патрабуюць структурных і дэмакратычных рэформаў, Пекін ніякіх умоў не ставіць. Адразу прапануе эканамічнае супрацоўніцтва, крэдыты і культурны абмен.

На цяперашні момант у 78 краінах свету дзейнічае 295 Інстытутаў Канфуцыя (аналаг Інстытута Гётэ або Французскіх цэнтраў). Акрамя папулярызацыі кітайскай культуры яны дапамагаюць студэнтам атрымаць стыпендыі на навучанне ў кітайскіх ВНУ.

Такая палітыка прыносіць Кітаю вялікія дыпламатычныя дывідэнды. Краіны Трэцяга свету ў выпадку канфліктаў будуць звяртацца да КНР як да пасярэдніка ў перамовах.

Аднак самі кітайскія чыноўнікі прызнаюць, што эканоміка і адукацыя — рэчы, хаця і важныя, аднак галоўную ролю ў пашырэнні інтарэсу да кітайскага рэжыму павінна адыграць прапаганда. «Сёння мы знаходзімся напярэдадні глабальнай кітайскай піяр-інтэрвенцыі. Яе мэта — зрабіць альтэрнатыву заходнім медыя, перш за ўсё ў краінах Поўдня», — лічаць у Кітаі.

Кітайскае афіцыйнае агенцтва «Сіньхуа» вядзе праграмы на сямі мовах. Як лічаць спецыялісты, хутка кампанія будзе мець карэспандэнта ў кожнай краіне свету. Штогод яе штат павялічваецца на 180 журналістаў. У гэтым годзе дзяржаўнае тэлебачанне Кітаю пачне трансляцыі на рускай і арабскай мовах. З мая ў Пекіне пачне выходзіць ужо трэцяя англамоўная газета. Нарэшце, плануецца заснаванне глабальнага кітайскага тэлебачання кшталту арабскай «Аль-Джазіры».

Прапаганда кітайскага шляху — справа не танная. Называецца лічба — 6 мільярдаў долараў у год. Для параўнання: бюджэт іншага глабальнага каналу — «Al-Arabia» — усяго 300 мільёнаў долараў на год. А арабская секцыя ВВС атрымлівае толькі 50 мільёнаў долараў.

Аднак трэба ўлічыць, што Кітай — самы вялікі ў свеце ўладальнік амерыканскай валюты і можа сябе дазволіць інвестыцыі ў палітычную рэкламу.

Між тым гэты год будзе тэставым для кітайскіх піяршчыкаў. Так склалася, што на 2009 год выпадаюць тры не вельмі прыемныя для афіцыйнага Пекіну юбілеі. 50 гадоў захопу Тыбету, 20 гадоў падаўлення студэнцкіх пратэстаў на плошчы Цяньаньмэнь і 60 гадоў заснавання КНР. Кожная дата стане падставай як мінімум для публічнай палемікі па ўсёй планеце. Агітатарам трэба будзе пастарацца, каб давесці афіцыйную пазіцыю. Зрабіць гэта вельмі цяжка. Натуральна, наўрад ці ў кітайскіх выпусках афрыканцы або азіяты змогуць пабачыць рэпартажы пра пратэсты ў Тыбеце або пра выпадак з масавым атручэннем школьнікаў малаком, у склад якога ўваходзілі хімікаты.

Цікава, што амерыканскія палітолагі пакуль ігнаруюць напалеонаўскія планы Пекіну экспартаваць сваю мадэль, навязаць масам і палітычнаму класу кітайскі лад жыцця і мыслення. Па-першае, не вядома, наколькі хопіць рэсурсу ў КНР на такія праекты ў час эканамічнага крызісу. Па-другое, як не круці, глядзець CNN або ВВС цікавей. Пакуль сцэнарыі праграмаў навін будуць зацвярджацца ў апараце кампартыі, ніякая годная канкурэнцыя заходняй мадэлі жыцця і сістэмы дэмакратыі немагчымая.



Прэзідэнт КНР разам з прэзідэнтам Танзаніі. 15 лютага 2009



Ху Цзіньтао вітаюць у Сінегале. 14 лютага 2009



Кітайскі прэзідэнт прэм'ер-міністр Маўрытаніі. 16 лютага 2009

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ



### БАДО РАМЕЛАЎ

Лідэр выбарчага спіску Левай партыі ў нямецкай зямлі Турынгія, дзе хутка адбудуцца мясцовыя выбары, стаў героям СМІ дзякуючы словам: «ГДР нельга лічыць неправавой дзяржавай». Пры гэтым Рамелаў таксама падкрэсліў, што ГДР была «таксама дзяржавай сацыяльнай справядлівасці». На яго думку, казаць, што ў ГДР панаваў не закон, а камуністы, «значыць пакрыўдзіць 16 мільёнаў былых грамадзян ГДР». Натуральна, правыя партыі і былыя ахвяры ўсходненямецкай дыктатуры жорстка рэагавалі на словы палітыка. Фактычна яны парушаюць правіла палітычнай дыскусіі ў ФРГ. Самае цікавае, аднак, у тым, што Рамелаў паходзіць з Заходняй Германіі і пераехаў у Турынгію толькі ў 1990 годзе. Больш таго, ён выхадзец з сям'і буйнага бізнесмена. У сувязі з гэтым шмат хто разглядае правакацыйныя заявы Бадо як спробу ажывіць настальгічныя настроі былых грамадзян ГДР, у склад якой уваходзіла Турынгія. Рамелаў не першы раз раздае кампліменты ГДР. Раней ён праславіўся сваім каментарам на адрас дрэннай сістэмы школьнай адукацыі ў ФРГ. «Лепшая формула адукацыі — гэта школьная сістэма ГДР мінус Марго Хонікер», — сказаў палітык (Марго Хонікер — былы міністр адукацыі ва Усходняй Германіі).



### ВІНІ МАНДЭЛА

72-гадовая былая жонка першага прэзідэнта Паўднёвай Афрыканскай Рэспублікі (ПАР) Нельсана Мандэлы, яшчэ нядаўна лічылася палітычным трупам. Прычына — скандал 2003 года, калі Віні абвінавацілі ў карупцыі. Раней яе нават падазравалі ў выкраданні і забойстве 14-гадовага падлетка. Пасля гэтага Віні разышлася з мужам і сышла з палітыкі. І раптам цудоўнае вяртанне. Былая жонка Мандэлы будзе ў топе выбарчага спісу партыі Афрыканскі нацыянальны кангрэс (ANC) на выбарах, якія адбудуцца 22 красавіка. На першым месцы ў спісе — старшыня партыі, на другім — цяперашні прэзідэнт ПАР, а на пятым — Віні ўласнай персонай. На думку большасці аналітыкаў, такое высокае месца ў спісе гарантуе Віні не толькі мандат, але і партфель міністра. Адзін з экспертаў лічыць, што вяртанне Віні ў палітыку звязана з яе вялікай папулярнасцю сярод гарадской беднаты. У часы апартэіду Віні была культавай фігурай супраціву. У сваю чаргу праціўнікі ANC назвалі з'яўленне ў спісе Віні Мандэлы «амаральным учынкам».

### АЛЬБЕРТА НУНЬЕС ФЕЙХОА

Старшыня кансерватыўнай Народнай партыі ў іспанскай вобласці Галісія зрабіў нешта незвычайнае. Яго ная структура атрымала на выбарах у рэгіянальны парламент абсалютную перамогу. Кансерватары атрымалі 39 мандатаў, у той час як іх канкурэнты-сацыялісты — толькі 24. Яшчэ 12 мандатаў маюць галісійскія нацыяналісты. Перамога Фейхоа цікавая тым, што Народная партыя цяпер перажывае кепскія часы. Шмат яе функцыянераў абвінавачаныя ў сістэмным раскраданні мясцовых бюджэтаў. Шмат хто лічыць, што скандал быў замоўлены сацыялістамі, якія фармуюць цэнтральны ўрад, з мэтай дыскрэдытацыі канкурэнтаў напярэдадні выбараў. Так ці інакш, Альберта даказаў, што нават у такіх умовах можна перамагаць. Такім чынам, Галісія зноў вяртаецца ў рукі кансерватараў. У прынцыпе гэта пасуе мясцовай палітычнай традыцыі. З Галісіі паходзяць такі вядомы аўтарытарны палітык, як Францыска Франка. Тут таксама знаходзяцца гістарычная радзіма сям'і Фідэля і Рауля Кастра.



ВІЛЕНСКАЯ ШКОЛА

# МАСТАК ПАВЕЛ ЮЖЫК:

Сяргей ГВАЗДЗЁЎ

**Корпаючыся ў слаба абжытай спадчыне і лёсах заходнебеларускіх мастакоў, я зрабіў «адкрыццё»: даваў Бог ім век працяглы і творча ўрадлівы. За выключэннем тых, хто скончыў жыццё самагубствам, быў расстраляны органамі НКУС, заняволены ў Магаданскі ці які іншы канцлагер, загінуў пад нямецкімі бомбамі, быў выкінуты на эміграцыю або змушаны быў сядзець як мыш пад венікам у БССР.**

Тлумачэнні, відаць, палягаюць у рэфлексах. У інтэлігенцыі, складнікам якой ёсць творцы, надзвычай моцна развіты рэфлекс мэты. Акадэмік Паўлаў казаў, што рэфлекс — «асноўная форма жыццёвай энергіі кожнага з нас». Ён сцвярджаў: «Усё жыццё, усе яго паляпшэнні, уся культура робяцца рэфлексам мэты, робяцца толькі людзьмі, якія імкнуцца да той ці іншай пастаўленай мэты... жыццё перастае прывязваць да сябе, як толькі мэта знікае».

Не надта шматлікая заходнебеларуская інтэлігенцыя (даючы веры даследчыку М. Косману — 2,28 працэнта ў «Крэсах»), была ўзроўню высокага і гарту моцнага. Яе высілкамі і энергіяй жывіўся рост нацыянальнай свядомасці, актывізаваўся сацыяльны, культурны і вызваленчы рух, беларускае жыццё ўвогуле.

Звесткі пра жыццё і творчасць Паўла Южыка надта скупыя. Самая змястоўная на сёння крыніца — нарыс «Мастак родам з Вётхава». Належыць ён пяру знанага гісторыка культуры, доктара філалогіі, беларусіста Арсена Ліса. Але не меў тады пад рукою паважаны даследчык дакументаў, якія толькі зараз, амаль выпадкова, патрапілі на вочы. Мяркую, не лішне будзе ўдакладніць, прыўнесці якую новую крэску ў эскіз партрэта мастака з Вётхава, што на Смаргоншчыне.

## Настаўнік і мастак

10 сакавіка 1874 года святар Залескай Св. Пакроўскай царквы Іосіф Камінскі здзейсніў таямніцу хрышчэння немаўляці, нарачонага Паўлам (нарадзіўся 4 сакавіка 1974 года), сына былога садоўніка аранжарэі князя Агінскага, Тамаша Захаравіча Южыка і яго жонкі, хатняй гаспадыні Марыі Фадзееўны з вёскі Новааляксандраўка (Вётхава), аб чым і быў зроблены адпаведны запіс у кнізе.

Усе акалічнасці жыцця скіроўвалі хлопца, што атрымаў пачатковую адукацыю ў прыхадской Міхневіцкай школе, у рэчышча агульнае, афіцыйнае, праваслаўна-расійскае. Як Павел патрапіў у Маладзечанскую настаўніцкую семінарыю, невядома. Ці то бацька, прагны да ведаў, шукаў шляхі навукі для сына і знайшоў недалёка даступную навучальную ўстанову, ці то юнака запрыкмецілі дзяржаўныя «купцы», што рэкрутавалі тутэйшую моладзь пад расійскі трыкалор у аддаленых закутках былога Вялікага княства Літоўскага. Калі і так, то Тамаш Захаравіч, відаць, быў рады аддаць сына ў навуку за дзяржаўны кошт. Вядома, што ў 1893 годзе 19-гадовы юнак апрануў кумачовую кашулю-касаваротку, падвязаў яе папружкай з жоўтай цэшкай, на якой зззяла абрэвіятура МУС, заправіў сінія шаравары ў наваксаваныя боты і пачаў угрызацца ў граніт навукі.





14 ліпеня 1895 года Павел Южык атрымаў пасведчанне № 338 аб заканчэнні Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі. Працаваць выпала ў народных вучылішчах вёсак Сітцы і Падброддзе. Настаўнічаць было цікава. Але вярэдзіла душу прага да мастацтва. Малады педагог, відаць, быў знаёмы з трохі старэйшым за яго багамазам і жывапісцам рэлігійнай тэмы Францам Багданавічам Сташынскім (Смаргонь, 1868–1942), які параіў яму паспытаць шчасце ў першай і адзінай на той час мастацкай установе краю — Віленскай школе малюнку І. П. Трутнева.

Шмат намаганняў прыкладаў мастак з былых прыгонных І. П. Трутнеў па вяртанні акаляючых Вільню земляў у праваслаўе. Далучаў акадэмік сваіх гадаванцаў да царкоўнага жывапісу і пісання абразоў яшчэ са студэнцкай лавы. Сам больш за 20 гадоў быў царкоўным старастам віленскай Прачысценскай царквы, для якой выканаў іканастас (за жыццё акадэмік уласнаручна напісаў абразы для дваццаці іканастасаў!). Спрычыніўся да гэтай, не чужой яму, працы і Южык. Але не сталася пісанне абразоў для яго тады сэнсам жыцця. Клікалі зямныя справы. Пытанне — настаўнічаць на агульную карысць народу, сярод якога жыў, ці маляваць для царквы, для сябе — вырашылася неяк само сабой.

У 1901 годзе Павел вярнуўся на выкладчыцкую ніўку. «Сплочваць пазыкі» ды і жыццё наладжваць. 11 ліпеня 1908 года настаўнік Віленскай прыхадской вучэльні Павел Тамашавіч Южык, «павянчаўся ў Цатаўлянскай Багародзіцка-Казанскай царкве Ковеньскай губерні з дзявіцай Клаўдзіяй Усцінаўнай Дзерывозка».

А напярэдадні першай сусветнай вайны пачала складвацца і службовая кар'ера ў Дырэкцыі народных вучэльняў.

З вайной жа ўсё перайначылася. Заляманталі святары пра набліжэнне супастатаў. Беззваротна з'ехала ў Самару школа Трутнева. Спешна рыхтаваліся да ад'езду ў глыб Расіі дзяржаўныя ўстановы. Эвакуацыя ператваралася ў тлум бежанства. Пакавалася Канцылярыя народных вучылішчаў. Южык падзяліў лёс больш чым мільёна жыхароў краю.

## Бежанец

«Эвакуяваўся ў горад Роўна, дзе настаўнічаў...» — адзначана ў біяграфічнай занатоўцы. Апрача ўражанняў, мастацкі плён бежанскага перыяду — «альбом малюнкаў Южыка: тыпы, жанравыя сцэнкі з украінскага народнага жыцця», — сведчыць А. Ліс.

«Паступіў у мастацкую вучэльню Пензы». Гэта інфармацыя адносіцца, відаць, да канца 1917 — пачатка 1918 года. Як і чаму Павел апынуўся там, таксама невядома. Але губернская Пенза мела добрую мастацкую вучэльню, заснаваную ў канцы XIX стагоддзя губернатарам Сільверставым па ўзоры вучэльні Штыгліца. (Тут вучыліся такія творчыя асобы, як кубафутурыст А. Лентулаў, канструктывіст У. Татлін, акадэміст В. Волкаў і інш. У 1910 годзе ёе ўзначаліў вучань Рэпіна, выпускнік Пецярбургскай Акадэміі мастацтваў — М. Ф. Пятроў (1872–1941). У 1918 годзе вучэльню рэарганізавалі ў Вольныя мастацкія майстэрні і надалі ім статус вышэйшай навучальнай установы).

Папулярная ў парэвалюцыйныя часы форма Вольных мастацкіх майстэрняў (ВММ) адпавядала, як кажуць, «выклікам часу», рэвалюцыйнаму імкненню зруйнаваць і пераўвасобіць літаральна ўсё. Галасаваннем абіралі выкладчыкаў і дысцыпліны. Змагаліся за свабоду творчасці. Выбіралі жыццё і лёсы...

Наўрад ці Южык быў першым «аратарам» у тым мітынговым шматгалоссі. З цікаўнасцю, але і з насцярогай назіраў ён гэты рэвалюцыйны шал у мастацтве.

## Спадчына

З ацалелай спадчыны мастака работ вядома няшмат. Пашчасціла бачыць іх дзякуючы ласцы супрацоўнікаў Смаргонскага краязнаўчага музея — галоўнага захавальніка фондаў Надзеі Маркаўны Емельянавай і дырэктара музея Марыі Леанідаўны Майсені. Дзесятак камерных партрэтаў, кампазіцыя «Гувернантка з дзіцем», з два дзесяткі лірычных краявідаў 30-х гадоў рознай ступені захаванасці ды яшчэ колькі цудоўных, з глыбокім грунтоўным унутраным зместам, дасканала рэалістычных партрэтаў сваякоў канца 30-х гадоў у прыватнай калекцыі. Асабняком (стылёва і па часе выканання) стаіць партрэт старога ў акулярах і з доўгай сівой барадой. Ён уладкаваўся з разгорнутай кнігай на адкрытай тэрасцы на фоне буяючай зеляніны сада. Імаверна, што пагрудная, профільная выява, якая не так даўно, па стане сваёй захаванасці, была на мяжы небыцця — партрэт бацькі мастака, селяніна Тамаша Южыка. Нават гэты сціплы даробак дае ўяўленне пра мастака, дапамагае хоць контурна акрэсліць яго творчае аблічча, меркаваць пра творчы патэнцыял заходнебеларускага творцы.

Невялічкія абразы (дзіцячыя і жаночыя мадэлі), натоленыя сонцам, гучаць фарбамі спадзеву надыходзячага дня. Асобныя з партрэтаў абуджаюць у памяці вобразы Рэнуара, Сярова. Паясныя, пагрудныя выявы зафіксаваны то на рэалістычным, прыродным, то на ўмоўным, пададзеным як «каляровы шум», то на аднастайна роўным, нейтральным фоне. Адметныя работы і па каларыстыцы, і па пластычных прыёмах. Ад дынамічнай экспрэсіі (дзяўчына ў чырвонай кофтачцы) праз дасканалы рэалізм, што мяжуе з натуралізмам (аголеная натура), да далікатна-пяшчотных, іканапісных лесіровак. Усе з бачаных партрэтаў — стылёва розныя па мастацкім мысленні. Ёсць і агульнае, што яднае творы незалежна ад жанру. Яго душа — мастакоўская палітра. Аптымістычна-светлая, жыццядайная, пабудаваная на гарманічным спалучэнні лёгкавалошкавых, блакітных, ізумрудных, высакародных срэбна-шэрых і залаціста-охрыстых фарбаў, суладдзі цёплых і халодных тонаў. Палітра гэта ствapae спакойны і працяглы, святочна-чысты настрой. Напісаныя працы прыгожа, далікатна, не зважаючы ні на якія акалічнасці няпростых часоў.

У гады грамадзянскай вайны, што распачалася з усталяваннем Савецкай улады, у будынку ВММ месціўся шпіталь. Шмат хто з пастаяльцаў яго пакутаваў на тыфус. (У гэтым тоіцца псіхалагічная адметнасць характару ці стану асобных мадэляў, але гэта не надае жывапісу Южыка песімізму і безнадзейнасці.)

Майстэрні працавалі ўвесь час. Працягваў свае штудыі і Павел Южык. Застаючыся прыхільнікам рэалістычнага, адухоўленага мастацтва, ён не хлусіў сабе. Марковілася сэрца па Радзіме.

## Да дому

10 красавіка 1918 года Павел Южык атрымаў пасведчанне, з якога вынікала, што ён знаходзіцца ў адпачынку па 15 верасня 1918 года і мае права свабоднага праезду ў два бакі, права на атрыманне ільготных квіткоў як на цягніках, так і на параходах. Аднак у красавіку ён не паехаў. 3 чэрвеня 1918 года на гэтым жа пасведчанні кіраўнік майстэрні зрабіў дадатак наступнага зместу: Южык вязе з сабой эцюднік (скрынку) з фарбамі і пэндзлямі, карціны, неабходны рыштунак для малявання. І тады ён выправіўся ў дарогу. Чаму? Праванднраваць паўтары тысячы кіламетраў праз імперыю, ахопленую ліхаманкай рэвалюцыі, бандытызму, грамадзянскай вайны і акупацыяй, пад няпэўныя ўлады ў беларускім краі, каб праз колькі месяцаў прабіць гэты ж шлях у адваротным накірунку, да Пензы?

30 кастрычніка 1918 года Южык уладкаваўся на працу ў Пензенскі Губсавет. Не будучы палітычна заангажаваным, адукаваны, малады і поўны энергіі, ён прагне быць карысным людзям. Пачатак «ваеннага камунізму», чырвоны тэрор, незабяспечаныя харчовыя карткі не надта абнадзейвалі. Але кволіўся ў душы спадзеў... Раптам і сапраўды гэтая новая гармонія? Не тое, каб спакусіўся, але зацікавіўся. Працаваў як мае быць, аддана, сумленна, і мясцовыя ўлады ацанілі. Прапанавалі новае месца. Больш адказнае і «сытае», што таксама было істотным.

15 кастрычніка 1919 года Павел Южык атрымаў пасведчанне супрацоўніка НКВД № 837. Мусіць жа нехта кантраляваць мясцовыя ўлады, ахоўваць рэвалюцыйны парадак ад усялякай пошасці. (Арганізацыя яшчэ не мела надзвы-

# ШЛЯХ ДА СЯБЕ…

чайных паўнамоцтваў, як ВЧК.) Наўрад ці хто быў тады здольны сасніць чалавечы кошт будучай калектывізацыі, будоўлях сацыялізму, папраўча-працоўных лагераў, брацкіх магіл і бязвесных лёсаў.

Южык лічыў абавязкам служыць і выгодаў аніякіх не меў і не шукаў. Нядоўга фанабэрыўся Павел Тамашавіч у галіфэ і скуранай куртцы з рэвалюцыйным маўзерам. Не спакусіўся кар'ерай у «органах». Рознае можна меркаваць. І што характарам не сышоўся з тамтэйшымі рускімі калегамі ў разуменні такіх паняццяў, як «закон», «рэвалюцыйная неабходнасць», «спагада». А можа папросту на ўласныя вочы ўбачыў джына рэвалюцыі, выпушчанага з бутэлькі, і тады расчараваўся ў чарговай сацыяльнай утопіі? Хто ведае… Вядома іншае — ён трызніў Радзімай. Спраўна адзначаў пасведчанне на рээвакуацыю ў мясцовым бежанскім камітэце.

Дамоў! Мо па ўсталяванні польска-савецкай мяжы, а мо і раней. Радзіма ж не вызначаецца аблiччам пануючага рэжыму. Яна проста Радзіма.

## Да сваёй беларушчыны

Было яму ўжо пад пяцьдзесят, трэба было асталёўвацца, мець грунт пад нагамі, не сядзець жа на шыі ў пляменніка. З Вётхава рушыў Южык да Вільні. Спрабаваў наладзіць кантакты з Рускім домам. Але ў польскай Вільні, відаць, рускія — і карэнныя, і нядаўнія ўцекачы з бальшавіцкай Расіі — пачуваліся псіхалагічна не надта камфортна, а таму паводзілі сябе часам не дужа добразычліва. Мо таму, ці яшчэ з якой прычыны, у Паўла Южыка з імі і не заладзілася.

Неспадзяванкай сталася запрашэнне ў кастрычніку 1923 года на выкладанне малявання ў Віленскай беларускай гімназіі. Гэта «кузня беларускага духу» ад часоў свайго заснавання славілася дабратворнай атмасферай, самавітым педкалектывам, здольным упрыгожыць любую навучальную ўстанову.

Не варта шмат казаць, як часам міжвольна, у прыватных гаворках і дзелавым кантактаванні, на спеўных вечарынах, праз іншыя гімназічныя імпрэзы дабіраў Павел Южык сваю беларушчыну. Як насычаўся новымі ведамі і разуменнем з быццам бы звычайных кніжак-падручнікаў, зборнікаў вершаў, календароў-гадавікоў, разнастайных перыёдыкаў, на якія так багаты быў заходнебеларускі друк. Імаверна, што моцнае ўражанне на яго зрабіла «Геаграфія Беларусі» Аркадзя Смоліча, які і сам не так даўно працаваў у ВБГ. Праз гэтую кнігу-падручнік, вартую не аднаго фаліянта, Южык дазнаўся і пачаў усведамляць псіхалогію народа і асаблівасць беларускага светаўспрымання, увачавідкі ўбачыў, як краявід уплывае на станаўленне асобы. Здавалася, зразумеў сябе, уласны характар і беларускі свет увогуле. Ён нібы фізічна адчуў глебу пад нагамі. За гады працы ў ВБГ спакваля ўгрунтаваў падмурак для ўласнай душы. У свае амаль 50 гадоў пачаў



П. Южык. Сваячка



П. Южык. Юнацтва

Павел Тамашавіч засвойваць літаратурную беларускую мову і, відаць, трошкі яшчэ саромеючыся, намагаўся выкарыстоўваць яе ў побыце. «…Нават паспрабаваў напісаць паэмку па-беларуску аб лёсе дзяцей вёскі ў горадзе» (А. Ліс). У Беларускай віленскай гімназіі ён, пэўна, канчаткова ўсвядоміў, што ён не рускі, але яшчэ і не беларус.

Пачуваўся тутэйшым. Раз-пораз, узяўшы кіёк у руку ды прыхапіўшы эцюднік, выпраўляўся на ўскрайкі горада ў Новую Вілейку, ці на ўзгоркі «польскай Швейцарыі» — ваколіцы Нова-Вільні, маляваць. Апынуўшыся сам на сам з нерукатворнай прыгажосцю натуры, усё болей і болей прагнуў увасобіць на палатне ўвесь неразменны на медзякі мітусні і «значных лёсавызначальных падзеяў» свет.

Істотнымі былі «гімназіяльныя» часы ў жыцці мастака і настаўніка, струменілі яны павольна, але не без шурпатасцяў. Непасрэднасць і натуральнасць падлеткаў, іх прага да ведаў цешылі і бадзёрылі. Але іх «юнацкі максімалізм», а яшчэ больш зачараваны позірк у бок камуністычнага Усходу, які ён пабачыў на ўласныя вочы, а мо і «абпёкся», змушалі трымацца трошачкі ў баку.

Не ў хаўрусе, але засяроджана і самастойна рабіў ён што мог. Рэальна. Ніколі не адмаўляў аднавяскоўцам у дапамозе па кантактах з адвакатамі, дапамагаў рыхтаваць судовыя скаргі па спрэчных пытаннях. Вяскоўцы ж ставіліся да «Тамашавіча» адпаведна. З павагай, хоць і не ўлягаў ён, што дзівіла суседзяў-сялянаў, у гаспадарчыя клопаты, усё болей маляваў і настаўнічаў.

Ва ўсіх ягоных жыццёвых захадах чулася, што хоць і не атаясамліваў, то ставіў побач і ўпоравень такія паняцці, як асвета і свядомасць. Кім, як не «тутэйшым», быў яго бацька, селянін-садоўнік, які назву кожнай травінкі-былінкі, кожнай кветачкі ведаў, як гучыць яна на лаціне? Ды хіба толькі назоў ведаў? Павел Южык ішоў далей.

Адчуванне знітаванасці асветы з нацыянальнай свядомасцю не пакідалі, відаць, яго не толькі ў ВБГ, а і пазней, падчас настаўніцтва ў Віленскай духоўнай семінарыі, да 27 кастрычніка 1930 года. Неўзабаве 13 лістапада таго ж года Южык атрымаў ліст з Варшавы, з міністэрства асветы «ў сувязі з атрыманнем пенсіі».

## «Мілыя вобразы роднага краю»

Відаць, тады, на пачатку 1931 года і перабраўся разам з маладой, «гарадской» жонкай — Марыяй Аляксееўнай на сталае жыццё ў Вётхаў. Пабудаваў прасторны дом на моцным падмурку з пакоем-майстэрняй і вялікімі вокнамі, што глядзелі на таямніча-зменлівы лес. Пасадзіў «англійскую» (блакітную) елку перад домам, але да працы на спадчынным лапіку зямлі так і не прыгарнуўся. Аддаў у арэнду аднавяскоўцу, а сам жыў на сціплы пенсіён і працягваў маляваць, ішоў да свайго небакраю, не пакутуючы ад «адсутнасці творчай атмасферы». Партрэты аднавяскоўцаў і сваякоў, былых вучняў, а асабліва краявіды разыходзіліся па акрузе.

Краявіды някідкія, абагульненыя, выразна лаканічныя ў кампазіцыйнай будове і колеравым рашэнні, нават аскетычныя. Іншыя з іх, з добрым адчуваннем перспектывы, насычаныя паветрам, дэталёва-падрабязныя, са складаным колеравым гучаннем, багатыя на разнастайныя цені і рэфлексы. «Родныя вобразы роднага краю» — ваколіцы Вётхава і Залесся былі часткай яго існасці, а ён, у сваю чаргу, мусіць адчуваў сябе неад'емнай часцінкай гэтай натуры. Шчасцем гэтай еднасці ён дзяліўся з усімі.

Бачыў прыгажосць натуры, вычуваў яе ў сваёй душы, пісаў усё новыя і новыя творы. Пісаў усё. Ад мройлівага ранішняга золку (дзяцінства — прадвесня), да згасаючых прамянёў (ці водбліскаў) самотнай восені. Да сталасці, да надыходзячай неспазнанасці казачнага пераўвасаблення краявіду ў зіму. У цнатліва чысты подых белага колеру, якім быў захоплены ўсё жыццё.

«Карткі» (краявіды), як іх і зараз называюць мясцовыя жыхары, не толькі хораша і настраёва перадавалі партрэтнае падабенства «роднага кута» ці якога яго аскепка. Бязмежная, як сама натура, нізка яго не атрыбутаваных і не датаваных краявідаў перадавала розныя поры году, станы, настрої і нюансы прыроды і ўвасабляла замкнёнае каляндарнае кола.

Зразумела, што «карткі» гэтыя, блізкія душы і зразумелыя чалавеку зямлі, знаходзілі ў іх непасрэдна шчыры эмацыйны водгук.

Старажылы і суродзічы Паўла Тамашавіча згадваюць і доўгачаканыя, але заўжды раптоўныя святы вынасу іконы з яго дома-майстэрні (у перадваенныя гады Южык шмат пісаў абразоў для навакольных цэркваў). Асабліва ж дбаў пра старажытную, ад XVI стагоддзя, Залескую царкву, якую спалілі ў сярэдзіне 60-х XX стагоддзя, дзе ягоныя абразы суседзілі з іканапіснымі дарункамі князёў Агінскіх.

## Сыход

Ад верасня 1939 года жыццё душы зніякавела. Наўрад ці Южык зразумеў гэта, хутчэй адчуў душой. Вакол загучалі новыя песні і лозунгі, паўсюдна адбываліся народна-вітальныя сходы, утвараліся сельсаветы, фарміраваліся атрады «Рабочай гвардыі». Дзялілі зямлю. Пачыналі карчаваць эксплуататарскі элемент.

Балюча, відаць, адгукаўся ва дас пад падзеяў у чуллівай душы не маладога ўжо мастака. Не выключана, што і самаму прыйшлося «паспавядацца» ў другой палове сакавіка 1940 года перад кампетэнтнымі органамі. Лозунг новай улады: «*Кто не работает, тот не ест*». І мусіў пенсіянер Южык выкладаць маляванне ў Залескай школе.

З 1 кастрычніка 1941 года Павел Южык настаўнічае не толькі ў Залескай, але і ў народнай школе ў Сіньках, але ўжо з іншай прычыны, пра што сведчыць даведка, выдадзеная Маладзечанскім раённым аддзелам народнай асветы 5 красавіка 1943 года. «Не дзеля большага кавалка хлеба …заробак настаўніцкі быў сціплы, ледзь не сімвалічны… быў клопат, каб дзеці ў час ваеннага ліхалецця не заставаліся без школы, не дзічэлі» (А. Ліс).

Усё мацней і мацней грукатала на Усходзе. Але аперацыі «Багратыён» Павел Южык не дачакаўся, 16 сакавіка 1944 года завяршыў свае зямныя справы і пайшоў з гэтага жыцця да свайго небакраю.

Крый Божа каму нават увідзець крык болю і адчаю Марыі Аляксееўны, «гарадской паненкі», над неспрактыкаванасцю якой вяскоўцы незласліва кпілі… Хавалі мастака, настаўніка, сапраўднага вясковага інтэлігента, свайго «Тамашавіча» ўсім Вётхава. З непакрытымі галовамі ішлі сяляне, вучні — былыя і тагачасныя.

Больш чым з паўстагоддзя таму распачалося вяртанне да нас спадчыны мастака. Не надта шпаркае і далёка яшчэ не завершанае.

ЦІКАВА

# САНКТУАРЫЙ СВ. МІКАЛАЯ І МЕМАРЫЯЛ БОНЫ СФОРЦА, ПОЛЬСКАЙ КАРАЛЕВЫ І ВЯЛІКАЙ ЛІТОЎСКАЙ КНЯГІНІ

Аляксей ХАДЫКА

**1 сакавіка 2009 года ў паўднёваітальянскім горадзе Бары, сталіцы правінцыі Апулія, адбылася ўрачыстая цырымонія перадачы Расіі гасцявога двара і праваслаўнай царквы св. Мікалая, якія месцяцца побач са старажытнай каталіцкай базілікай у гонар гэтага святога, дзе з XI стагоддзя спачываюць яго рэліквіі, перанесеныя з Міраў Лікійскіх. Перадаючы інфармацыю пра падзеі ў Бары, беларускія СМІ не паведамілі, аднак, што комплекс вялікай каталіцкай базілікі св. Мікалая гістарычна звязаны з нашай краінай значна даўней.**



Базіліка



Алтар св. Мікалая



Бона ў маладосці



Мемарыял Боны Сфорца

Мэрыя Бары атрымала кампенсацыю ў 13 мільёнаў еўра і казармы «Рассані» ў цэнтры горада для перамяшчэння офісаў з былога двара. У 1937 годзе ён быў выкуплены італьянскай адміністрацыяй, калі руская царква не мела сродкаў утрымліваць уласнасць у Італіі. Сёння часы мяняюцца. Сімвалічны жэст прыхільна ўспрынялы ў Расіі і на каталіцкім Захадзе. Для адных ён — знак адраджэння РПЦ, для другіх — праява міратворчага экуменічнага руху.

Італьянскі прэзідэнт Джорджа Неапалітана, калі віншаваў у Бары расійскага калегу Дзмітрыя Мядзведзева і перадаваў яму залатыя ключы ад двара, назваў падзею «праявай талерантнасці перад тварам фундаменталізму, які пагражае запаланіць цывілізаваны свет». Мэр Бары Мікеле Эміліяна параўнаў свой горад з «брамай на Усход» і выказаў спадзяванне, што падзея будзе ўспрынятая як праява любові да «рускіх братоў».

Расійская рэзідэнцыя была пабудавана ў 1910–1913 гадах Аляксеем Шчусевым, у далейшым знаным савецкім архітэктарам, аўтарам праектаў маўзалея Леніна, гасцініцы «Масква», будынка НКУС і Казанскага вакзала ў Маскве ды іншых помнікаў новай атэістычнай эпохі Расіі. За што атрымаў чатыры Сталінскія прэміі — іронія лёсу.

## Авантура XI стагоддзя

Узгадкі пра сувязі комплексу вялікай каталіцкай базілікі св. Мікалая з нашай краінай пачнём з далёкай гісторыі. Прыгаданы яшчэ Гарацыем і Тацытам, горад Бары наноў усплыў на старонках гісторыі пасля панавання сарацынаў (841–871), калі ім авалодалі візантыйцы, зрабіўшы ў 968 годзе рэзідэнцыяй катапана, імператарскага намесніка Лангабардскай акругі, гэта значыць Паўднёвай Італіі. Але поўдзень Італіі ў 1070-я гады апанавалі нарманскія наёмнікі, і месцам сваёй рэзідэнцыі выбралі Салерна.

Так Бары, найбагацейшы горад рэгіёна і цэнтр гандлю, апынуўся перад пагрозай заняпаду. Гандлёвая алігархія горада пасля гэтага знайшла выратаванне ў здзяйсненні авантурнага плану, тыповага для духу эпохі. У 1087 годзе тры караблі з Бары, наладаваныя зернем і іншай прадукцыяй сельскай гаспадаркі, накіраваліся звыклым маршрутам у Сірыю, і, закупіўшы там усходнія тканіны, рушылі ўздоўж узбярэжжа Малой Азіі, каб спыніцца бліз Міраў Лікійскіх. У гэтых мясцінах, праслаўленых св. Мікалаем, дзе ў царкве спачывалі яго мошчы, у XI стагоддзі з'яўлялася ўсё болей турак. Таму можна было меркаваць, што загадзя спланаванае камандай караблёў дзёрзкае выкраданне з царкоўнай грабніцы яго парэшткаў хрысціянскі свет успрыме як выратаванне ад няверных. А Бары займее свайго патрона, падобна як Венецыя — святога Марка.

Так і адбылося. Ужо ў 1087–1089 гадах для размяшчэння святых мошчаў завяршылася ўзвядзенне крыпты з прастолам, якім кіраваў абат Бенедыктынскага кляштара, а пазней арцыбіскуп Ілія, выкарыстаўшы пры гэтым для будучай базілікі перабудаваныя рэшткі былога палаца візантыйскага катапана. Таму формы вялізнай раманскай царквы асіметрычныя, а ў скульптурным дэкоры прысутнічаюць свецкія матывы — выявы быкоў і сфінксаў. А крыпта св. Мікалая, мяркуючы па візантыйскай форме капітэляў калон з кветкаваРаслінным дэкорам, першасна служыла залай палаца катапана. Гэта ж Італія, дзе часам культурныя слаі розных эпох папросту накладаюцца адзін на другі.

## Бона — жонка Жыгімонта

А чарговым дадаткам, які звязаў далёкі італьянскі горад з нашай краінай непарыўнымі сувязямі гісторыі, было размяшчэнне ў галоўным алтары базілікі ў 1593 годзе скульптурнага надмагілля вялікай княгіні літоўскай і польскай каралевы Боны Сфорца, якая памерла ў Бары ў 1558 годзе.

Будучая ўладарка Польшчы і Літвы нарадзілася 515 год таму, 2 лютага 1494 года ў сям'і міланскага герцага Джан Галеаца Сфорца і Ізабелы Арагонскай, дачкі неапалітанскага караля. А ў 1518 годзе, воляю дынастычных раскладаў, што мусілі зблізіць палітычныя пазіцыі Ягайлавічаў і Габсбургаў, і па рэкамендацыі Уладзіслава Ягайлавіча, караля Чэхіі і Венгрыі, зрабілася другой жонкай яго аўдавелага малодшага брата Жыгімонта Старога. Партыя з палітычнага гледзішча для Жыгімонта была не надта выгадная, але падсалоджаная 200 000 залатых венгерскіх дукатаў прыданага і тым, што 50-гадовы кароль ажаніўся з прыгожай (хаця і невысокага росту) і добра адукаванай 24-гадовай дзяўчынай.

«Добра адукаваная» — сціпла сказана, калі ўлічыць яе гуманістычнае выхаванне, веданне права, філасофіі, палітыкі і валоданне некалькімі мовамі. Разам з 300 асобамі яе двара — ад музыкаў і мастакоў да кухараў — у Польшчу і ВКЛ канчаткова прыйшла ва ўсе сферы грамадскага жыцця культура Рэнесансу. Калі рэнесансавы Вавель у Кракаве ўжо будаваўся, то падобны па стылі палац, які зараз рэстаўратары аднаўляюць побач з віленскай катэдрай, паўстаў за часы Боны.

У прыдворнае жыццё прыйшлі балі і турніры, а ва ўжытак за сталом — відэльцы. Нашы продкі пазнаёміліся з апельсінамі, лімонамі, гранатамі, фігамі, шматлікімі прыправамі — шафранам, імбірам, цынамонам, нарэшце з цукрам. На сталах з'явіліся алівы, каштаны, разынкі, марцыпаны, рыс, а ў гародах пачалі вырошчваць сваю салату. Літоўска-беларуская арыстакратыя канчаткова засвоіла густ да заходнееўрапейскай моды. Нарэшце, сын Боны Жыгімонт Аўгуст паклаў пачатак традыцыям калекцыянавання мастацкіх твораў і рарытэтаў, што ў хуткім часе зрабіла музейныя зборы магнатэрыі ВКЛ аднымі з багацейшых на кантыненце.

## Каралева

Цягам сваёй доўгай барацьбы за ўплыў каралеўскай сям'і на справы ў дзяржаве коштам абмежавання правоў магнатаў, асабліва Радзівілаў, Гаштальдаў, Астрожскіх, Ілінічаў, Бона назаўсёды ўвайшла ў гісторыю, якая пісалася не без дапамогі гэтых сем'яў, як «злая каралева».

Але нельга не памятаць, што якраз яе памкненні навесці парадак з пункту гледжання пануючай дынастыі наўпрост ці ўскосна выліліся ў цэлы шэраг прагрэсіўных пераменаў. Пачынаючы з дзяржаўных маёнткаў, палепшыліся спосабы землекарыстання (з меліярацыяй і больш дасканалым севазваротам). Зерне, лён і каноплі пачалі вырошчваць для продажу за мяжой, што хутка вывела ВКЛ на становішча адной з лепшых экспартна-арыентаваных гаспадарак кантынента. Апошняму паспрыяла «валочная памера», пераход на падаткаабкладанне не з асобнай гаспадаркі, а з адзінкі памеру зямлі, валокі (21,36 га). «Памера» здзейснілася канчаткова ў 1557 годзе, на наступны год пасля ад'езду Боны назад у Італію. Варта прыгадаць і першую кадыфікацыю права ВКЛ у выглядзе Статута 1529 года.

**Працяг у наступным нумары**

АБ'ЯВА

**Літаратурныя сустрэчы на сядзібе ТБМ**

**17 сакавіка**

**Сустрэча з пісьменнікам Васілём Якавенкам**

Тэма: размова аб падрыхтоўцы 2-га выдання трылогіі «Пакутны век»

Прэзентацыя новай кнігі аўтара «Нячывелле»

Пачатак а 18 гадзіне

Уваход вольны

(Мінск, вул. Румянцава, 13)

Новы Час

Масава-палітычная газета

Выдаецца з сакавіка 2002 г.

Галоўны рэдактар **Алена Анісім**

Шэф-рэдактар **Аляксей Кароль**

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1798 ад 12 верасня 2008.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 6.03.2009. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.